ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. — 90 к.
„ 3 мес. 2 р. 60 к.
„ 6 мес. 5 р. —
„ 12 мес. 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасьлядні тэкст—у два разы дарожэй. При цыкліраваным друкаваньні—скідкі. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адагну.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Навны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 24 сакавіка 1930 г.
№ 69 (3577)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

У бліжэйшыя дні скончыць перавод калгасаў на новы статут

Звальняць з працы ўсіх работнікаў, якія супраціўляюцца правядзеньню ў жыцьцё рашэньняў партыі і ўраду

Ня змазваць палітычнага значэньня перавыбараў заўкомаў саюзу мэталістых

«Зьвязда» ўжо некалькі разоў сыгналізавала аб спазьненьні разгортваньня кампаніі перавыбараў заўкомаў саюзу мэталістых, ужо некалькі разоў паведамляла аб фактах вельмі нядбайнай і дрэннай падрыхтоўкі да перавыбараў. Між тым, паведамленьні нашых рабкораў і карэспандэнтаў сьведчаць, што і да гэтага часу значнага перапому ў падрыхтоўцы да перавыбараў няма.

ПК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб перавыбарах заўкомаў саюзу мэталістых паказаў, што «перавыбары заўкомаў саюзу мэталістых павінны стаць узорам для іншых саюзаў» і запрапанаваў «асаблівую ўвагу ўдзяліць падрыхтоўцы перавыбараў». Гэтая дырэктыва многімі нашымі прафсаюзнымі і партыйнымі арганізацыямі ня выконваецца. Таму мы маем рад прарываў на прадпрыемствах.

Трывожны сыгнал мы атрымалі з Віцебску. Цьвёрдыя тэрміны падрыхтоўкі да перавыбараў сарваны. Зараз віцебскія прафарганізацыі пачынаюць сьпяшацца, жадаючы «галёпам коньніка» нагнаць прапушчанае. Гэта прыводзіць да скалечваньня цэхавых сходаў. Былі, нават, выпадкі зрыву цэхавых сходаў з прычыны няяўкі рабочых. Па тэй-жа прычыне на асобных сходах вельмі нізкая наведваемасьць (ліцейны цэх і вячэрняя зьмена заводу «Чырвоны Мэталіст», завод «Чырвоны Молат»).

Позна пачалі падрыхтоўку ў Магілеве, Воршы, Бабруйску, спазьніліся і ў Гомелі. Гэта стварае пагрозу невыстарчальнай прапрацоўкі асноўных задач сучасных перавыбараў і іх палітычнага значэньня.

Прафапарат у многіх мясцох яшчэ не перайшоў на новыя формы і мэтады работы. Многія прафработнікі прабуюць прапесьці і перавыбары заўкому мэталістых па старых формах і мэтадах, крыху падмяніўшы іх новымі лёзунгамі.

У дапамогу перавыбарам не мабілізаваны заводзкія арганізацыі. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі амаль усюды прымаюць вельмі слабы ўдзел. Мабілізаваныя акруговымі прафбюро прафработнікі ў большасьці выпадкаў на прадпрыемствы не зьяўляюцца. Аб гэтым піша з Віцебску, аб гэтым сыгналізуюць з Магілева і інш. месц. Зусім слабы ўдзел прымаюць у кампаніі і рэдакцыі заводзкіх газэт і нават акруговых газэты («Камунар Магілеўшчыны»).

Такія адносіны да перавыбараў змазваюць усё палітычнае значэньне гэтай кампаніі.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове галоўным лёзунгам перавыбарнай кампаніі высунуў — «ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне пляну мэталяпрамысловасьці, шляхам мабілізацыі ўсяе масы рабочых мэталістых на выкананьне канкрэтных заданьняў па росьце прадукцыі, зьніжэньні сабекошту і паляпшэньні якасьці прадукцыі».

ЦК прапануе — «агонь самакрытыкі накіраваць на барацьбу з бюракратычнымі скажэньнямі гаспадарчага і прафсаюзнага апарату, у асаблівасьці з выторчай бесплянавасьцю гаспадарчых органаў, якая ў многіх выпадках зьяўляецца прычынаю распаду ўдарных брыгад і тым самы зрывае ход сацыялістычнага спаборніцтва».

Такім чынам, трэба было ў першую чаргу ўзмацніць уцягненьне ўсяе масы рабочых мэталістых у барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Між тым, факты, якія сёньня падае «Зьвязда», сьведчаць аб тым, што мясцовыя арганізацыі ня здолелі правесьці сапраўдную баявую мабілізацыю мас вакол пытаньняў вытворчасьці і выкананьня прамфінпляну. На магілеўскім заводзе «Адраджэньне»—адзначае наш карэспандэнт—асноўнае яшчэ ня зроблена: цэнтральныя пытаньні—барацьба за прамфінплян, перабудова прафработы, праверка кіраўніцтва ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам, ажыцьцяўленьне дырэктывы аб адзінаначальні—не знаходзяць у падрыхтоўцы поўнага адлюстраваньня.

Не зразумелі значэньня перавыбараў і кіраўнічыя арганізацыі на менскім «Зьльводзе». Падрыхтоўчая работа да перавыбараў заўкому павінна была палажыць канец нядбайным адносінам да вытворчасьці. На сходах шмат гаварылася аб новай структуры і формах работы заўкому, але ўсе даклады і гутаркі ня былі цесна ўвязаны з асноўнаю мэтай сучасных перавыбараў—дабіцца пералому ў адносінах усяго калектыву да вытворчасьці. Добраахвотнікам кепска растлумачылі іх задачы—таму з 40 добраахвотнікаў працавалі толькі 15-20 чалавек і то з халадком, таму выпадкі парушэньня працдысцыпліны з кожным днём павялічваюцца (калі ў лютым іх было 5, дык за першыя 20 дзён сакавіка, у самым, як кажуць, разгары падрыхтоўкі да перавыбараў, 10 выпадкаў), таму выпадкі спыненьня работы да гудка на 5-10 мінут ня зьнішчаны да гэтага часу.

Вось найбольш яскравыя прыклады вынікаў дрэннай падрыхтоўкі да перавыбараў заўкомаў. Па гэтых выніках мы будзем судзіць аб недахопах ці посьпехах перавыбарнай кампаніі, аб якасьці перабудаваньня прафработы, аб ступені прыстасаваньня ўсёй масавай работы да задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

Ленінскі прызыў ва ўдарныя брыгады падняў яшчэ на большую вышыню вытворчую ініцыятыву і актыўнасьць шырокіх рабочых мас. Перавыбарная кампанія заўкомаў саюзу мэталістых повінна дапамагчы новым заўкомам поўнасьцю накіраваць гэтую ініцыятыву і актыўнасьць на карысьць вытворчасьці, на барацьбу з усімі непаладкамі і недахопамі ў цэхах, на барацьбу за ажыцьцяўленьне пяцігодкі ў чатыры гады. Між тым, ударнік яшчэ ня стаў цэнтральнай фігурай у перавыбарнай кампаніі. Мясцовыя арганізацыі не павярнуліся яшчэ тварам да ўдарніка. Аб ударніках, аб іх рабоце, іх запатрабаваньнях, аб паляпшэньні кіраўніцтва ўдарным рухам у падрыхтоўцы да перавыбараў амаль забыліся.

Усе гэтыя парушэньні дырэктыў ЦК і вышэйшых прафорганаў тлумачацца выключна невыстарчальнай увагай да перавыбараў з боку мясцовых прафсаюзных і партыйных арганізацый. Аб чым кажуць такія факты, як, напрыклад, зрыў сходу на акулярнай фабрыцы ў Віцебску, з прычыны няяўкі дакладчыка, якога выпучыла акрпрафбюро, або тыя шматлікія факты, што падаюць нашы карэспандэнты, аб імкненьні раду вылучаных прафработнікаў ухіліцца ад удзелу ў перавыбарнай кампаніі?

Трэба змагацца з тэндэнцыяй марудна ня правядзеньня падрыхтоўкі і жаданьнем расцягнуць яе на больш доўгія тэрміны, але разам з тым, трэба памятаць, што было-б вялікай памылкай, на шкоду масавасьці кампаніі, надта сьпяшацца з днём перавыбараў. Без пярэдняй грунтоўнай масавай работы, бяз выразнага растлумачэньня рабочым сэнсу і важнасьці сучаснай перавыбарнай кампаніі—нельга сьпяшацца з перавыбарамі. Такія перавыбары, калі-б яны адбыліся, зьявіліся-б толькі выкананьнем абавязку, выключна фармальным падыходам да важнейшага пытаньня.

Трэба неадкладна дабіцца пералому ў падрыхтоўцы да перавыбараў. Час, які застаўся да перавыбараў, трэба максымальна выкарыстаць для ўзмацненьня падрыхтоўкі, для выпраўленьня памылак, дапушчаных на асобных прадпрыемствах.

У бліжэйшыя дні закончыць перавод С.-Г. арцеляй на новы статут

Тэлеграфнае распараджэньне Наркамзему СССР, Саюзу Саюзаў с.-г. каапэрацыі і Калгасцэнтру

Ёсьць рад фактаў, калі наперакор простаму ўказаньню партыі і ўраду калгасныя і зямельныя арганізацыі замест таго, каб узяць на сябе ініцыятыву пераводу с.-г. арцеляй на статут, ухвалены Калгасцэнтрам, адобраны Наркамземам і зацьверджаны СНК і ЦВК Саюзу, супраціўляюцца яго правядзеньню. Гэта дае магчымасьць у асобных выпадках варожым калектывізацыі элемэнтам зрываць самую аснову арганізацыі арцеляй: абагуленьне сродкаў вытворчасьці, патрэбных для паляводзтва.

Катэгарычна прапануем У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ЗАКОНЧЫЦЬ ПЕРАВОД С.-Г. АРЦЕЛЯЙ НА КАНЧАТКОВЫ СТАТУТ ШЛЯХАМ МАСАВАЙ РАБОТЫ З КАЛГАСЬНІКАМІ з тым, каб адначасова сканцэнтраваць усе намаганьні на сапраўднай падрыхтоўцы да сяўбы (забесьпячэньне коняй кармамі, арганізацыя належнага догляду за коньмі, прывядзеньне машын у парадак, разьбіўка людзей, рабочае жывёлы і машын на брыгады, спробныя выхады ў поле).

УСІХ РАБОТНІКАЎ ЗЯМЕЛЬНЫХ ОРГАНАЎ І КАЛГАСНА-КААПЭРАЦЫЙНАЙ СЫСТЭМЫ, ЯКІЯ СУПРАЦІЎЛЯЮЦЦА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЮ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДУ, БЕЗАДКЛАДНА ЗЬНІМАЙЦЕ З РАБОТЫ І ЗАМЯНЯЙЦЕ ЛЕПШЫМІ РАБОТНІКАМІ.

Саюзнаркамзем ЯКАЎЛЕЎ.
Саюз Саюзаў АДЗІНЦОЎ.
Калгасцэнтр ЮРКІН.

Папраўка

Па тэхнічным недаглядзе ва ўчарашнім нумары пераблыталіся некалькі радкоў у адным з адказаў на пытаньні, якія былі заданы НКЗ БССР тав. Рачыцкаму, што зрабіла гэты адказ ня зусім зразумелым. Прыводзім яго цалкам зноў:

ПЫТАНЬНЕ. Як быць з тымі сялянамі, якія падаюць заявы аб выхадзе з калгасу і як зямляўпарадкаваць такія калгасы?

АДКАЗ. Пляшча калгасу павінна зямляўпарадкавацца ў разьмеры, які адпавядае колькасьці гаспадарак, што фактычна ўвайшла ў калгас, г. зн. прыняла і падпісала новы статут. У тых калгасах, дзе статут яшчэ ня прыняты, гаспадаркі, якія падалі заявы аб выхадзе з калгасу, ня могуць лічыцца членамі калгасу. Апошняе адносіцца да тых калгасаў, дзе ёсьць ужо поўнай ўпаўненасьць у тым, што гаспадаркі, якія падалі заявы аб выхадзе, у бліжэйшы-ж час зноў ня ўвойдуць у калгас.

Калі заяву аб выхадзе з калгасу падае селянін, які прыняў і падпісаў новы статут сам, або зрабіў гэта праз свайго ўпоўнаважанага, дык ён ня можа прэтэндаваць на зварот яму свайго ўчастку зямлі, згодна статуту. Ён можа быць надзелены зямлёю з запаснага фонду, калі такі ёсьць у даным месцы і палкам не перададны калгасу.

Аднавіць партыйна-савецкае кіраўніцтва Горацкага раёну

Нядаўна мы адзначалі на старонках «Зьвязды» аб грубых палітычных памылках і скажэньнях лініі партыі пры правядзеньні калектывізацыі ў Горацкім раёне. Замест растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас у радзе сельсаветаў раёну ўжываліся адміністраваньне і пагрозы. Гэта выкарыстаў кулак для свае агітацыі супроць калгаснага будаўніцтва, для дэзарганізацыі работы калгасаў.

Партыяй даны выразныя дырэктывы аб безадкладным выпраўленьні дапушчаных памылак, але як-жа Горацкае партыйнае і савецкае кіраўніцтва выпраўляе гэтыя памылкі?

Рад мясцовых працаўнікоў злачына марудзяць з пераводам калгасаў на новы статут сельска-гаспадарчай арцелі. Некаторыя працаўнікі нават выказваюцца супроць статуту. Нічога ня зроблена для папулярызацыі статуту сярод асноўных мас сялянства. На радзе сходаў калгасьнікаў мясцовыя працаўнікі тлумачаць новы статут не як аснову для ўсяе работы ў галіне калектывізацыі, а як «папраўкі» да ўсіх ранейшых статутаў.

У вёсцы Арлы, напрыклад, калгасьнікі запрапанавалі праўленьню склікаць сход і абгаварыць пытаньне аб новым статуце, абагуленьні рабоча-прадукцыйнай жывёлы і звароце жывёлы аднакароўным гаспадаркам. Праўленьне калгасу адмовілася склікаць сход, кажучы, што кароў можна і бяз сходу разабраць. Зразумела, што гэта выкарысталі кулакі для сваёй агітацыі. Сяляне самі склікалі сход і стыхійна разабралі кароў.

Такім чынам, тут новы статут аб сельска-гаспадарчай арцелі растлумачваюць бедняком і серадняком по мясцовыя партыйныя і савецкія працаўнікі, а кулакі. Горацкія-ж раённыя арганізацыі бязьдзейнічаюць і чагосьці чакаюць. Нічога ня зроблена ў раёне для арганізацыі груп беднаты ў калгасах.

У рад калгасаў пралезьлі кулакі і вядуць там шкодніцкую работу. Беднота ў гэтых калгасах прыціснута. Чыстка калгасаў праходзіць вельмі марудна і яшчэ ня скончана — яна праводзіцца без прыцягненьня бядняцкіх мас.

Ня лепш стаіць справа ў раёне і з практычнаю падрыхтоўкаю да сяўбы. Вось некалькі прыкладаў. Ачыстка збожжа выканана толькі ў разьмеры 70 проц. Дагэтуль яшчэ ня створаны насенныя фонды бульбы і раду іншых тэхнічных культур. Мінэральныя ўгнаеньні, якія ёсьць у раёне, ляжаць на складах райкалгассаюзу. Мабілізацыя сродкаў насельніцтва ідзе таксама марудна. Трактарныя абавязацельствы рэалізаваны ўсяго на 2.000 руб., замест 21.000 руб., вызначаных паводле пляну. Такое-ж становішча са зборам паёў і пратэрмінаваных пазык. Начальнік міліцыі афіцыйна паведаміў у РВК, што са спагнаньнем пратэрмінаваных пазычак трэба пачакаць, «бо Горкі — раён суцэльнае калектывізацыі» (!).

Зямля для калгасаў яшчэ не адведзена, рабочыя пляны ў калгасах ня складзены, аб арганізацыі працы ў калгасах яшчэ ня думалі. Усё гэта ў той час, калі ў раёне маецца 13 агранамаў і 11 каморнікаў і тут-жа сельска-гаспадарчая акалэмія.

Камэнтары да ўсяго гэтага лішнія.

Партыйна-савецкае кіраўніцтва Горацкага раёну, якое дапусьціла грубейшыя скрыўленьні пры правядзеньні калектывізацыі, ня толькі не прызнае сваіх памылак і выпраўляе іх, але нават настойвае на іх, не арганізуе пераводу калгасаў на новы статут, не разгортвае належнай работы сярод батрацка-бядняцкіх мас і, нават, не арганізуе адпаведнай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Такое кіраўніцтва павінна быць зараз-жа адноўлена.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Перавод калгасаў на новы статут праходзіць вельмі марудна

Паводле даных Калгасцэнтру БССР, перавод калгасаў на новы статут праходзіць вельмі марудна. Месцы спаслаюцца на адсутнасьць друкаваных статутаў і што гэта, нібы, галоўным чынам перашкаджае працы.

Сапраўдную-ж прычыну зьяўляецца тое, што ў многіх мясцох не разумеюць вялізарнага значэньня статуту ў справе замацаваньня калгасаў і далейшага разьвіцьця калгаснага будаўніцтва.

Белкалгасцэнтр запрапанаваў акркалгассаюзам не пазьней 1-га красавіка скончыць усю работу па пераводзе калгасаў на новы статут, шырока растлумачыўшы калгасьнікам парадак абагуленьня сродкаў вытворчасьці, прынцыпы арганізацыі працы і г. д.

Перавод сельска-гаспадарчых арцеляй на статут камун бяз згоды па гэта акркалгассаюзу і акрвыканкому не павінен дапускацца.

Акркалгассаюзам прапануецца спыніць усякае ўзбуйненьне і зьліваньне калгасаў да правядзеньня веснавой сяўбы, з тым, каб адзялення буйных калгасаў карысталіся патрэбнай самастойнасьцю ў правядзеньні ўсіх работ па веснавой сяўбе.

Сотні стагоў сена гніюць на балоце

Вінаватых прыцягнуць да судовай адказнасьці

Па калгасах Слуцкага раёну (Бабруйская акруга) адчуваецца востры недахват кармоў. У асобных калгасах становішча награжаючае. Той факт, што раён мае патрэбу зараз у 10.000 пуд. канцэнтраваных кармоў, гаворыць сам за сябе. Яшчэ горш справа абстаіць з грубымі кармамі. Адзін толькі калгас «1-га мая» мае патрэбу ў 8.000 пуд. грубых кармоў.

Чаму ў Слуцкім, самым эканамічна моцным раёне БССР, адчуваецца недахват фуражу?

Прычын тут трэба шукаць у бязьдзейнасьці мясцовых установаў. На працягу ўсёй зімы яны зусім ня цікавіліся кармавым пытаньнем, ня гледзячы на тое, што газ. «Зьвязда» ўвесь час біла трывогу. Ні сельсаветы, ні райвыканкомы ня ўлічвалі запасаў сена, якое знаходзілася ў стагох на балотах. Пры раскулачваньні кулацтва ўтойвала тое сена, якое ім ня было звезена з балота.

У выніку ўсяго гэтага сотні стагоў сена ня зьвезены і засталіся гніць на балоце.

Характэрней за ўсё тое, што раённыя работнікі не прызнаюць сваёй віны ў гэтым.

Мы пратрабуем тэрміновага расьсьледваньня гэтае справы і прыцягненьня да адказнасьці вінаватых.

Брыгадзір «Зьвязды» КАРАЧУН.

БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД З ГАМЯЛЬЧАН

Гамяльчане арганізавалі пробную сяўбу ў калгасах

Гэта—лепшы сродак праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы і ўніканьня памылак

АДКАЗ ПАПЕ РЫМСКАМУ

Польскі калгас імя Дзяржынскага (Буда-Кашалеўскі раён, Гомельшчына) у адказ на антысавецкую вылазку рымскага папы пастанавіў як мага лепш падрыхтавацца да веснавой сяўбы. З гэтай мэтай 22 сакавіка быў арганізаваны выхад у поле для пробнае сяўбы. Калгас паказаў надзвычай добрую падрыхтаванасьць да сяўбы. Адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар у спраўнасьці, арганізаваныя конныя калёны ў парадку і г. д. Калгасьнікі віталі савецкую ўладу і заявілі, што дадуць рашучы адпор імпэрыялістым, якія на чале з рымскім папаю рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць краю, дзе сапраўды будуецца сацыялізм.

П.

„СЕЛЯНІН" ПАДРЫХТАВАНЫ

У калгасе «Селянін» (Хойніцкі раён, Гомельшчына) 21 сакавіка была праведзена пробная сяўба. Збор калгасьнікаў быў назначаны на 7 гадз. раніцы. На прызначаны час усе былі на месцы збору, СПАЗЬНІЎШЫХСЯ ЗУСІМ НЯ БЫЛО, зьявіліся ўсе калгасьнікі. САБРАЛАСЯ ТАКСАМА БОЛЬШ 300 СЯЛЯН З ІНШЫХ ВЁСАК глядзець на калгасьнікаў. Роўна а 8 гадз. выехалі ў поле — 51 пара-конных плугоў, 45 трох конных барон, 4 двухконныя сявалкі, 4 двухконныя культыватары, 10 цяжка нагружаных фурманах павезьлі насенны матар'ял. Калгасьнікі былі падзелены на групы і брыгады.

Пробная сяўба прайшла зусім арганізавана і паказала дысцыплінаванасьць калгасьнікаў. Сельска-гаспадарчы інвэнтар, нядаўна адрамантаваны, знаходзіцца ў парадку, няспраўным быў АДЗІН плуг, ды ў АДНАГО аратага парваўся пастронак.

Пасьля пробных работ па сяўбе адбыўся пробны-ж мітынг. Калгасьнікі з натхненьнем і энтузіязмам чакаюць сапраўднай сяўбы, абяцаючы выканаць і перавыканаць вызначанае пашырэньне яравога кліну.

А.

РУКІ ПРЭЧ АД САВЕЦКАГА САЮЗУ!

Мы не дапусьцім сарваць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва

ГОЛАС ПРАЦОЎНЫХ БССР

Нікому не дазволім сарваць сацыялістычнае будаўніцтва

КОЙДАНАВА, 20. Працоўныя Койданава сабраліся ў пардомс, каб пратэставаць супроць «крыжовага паходу». Усе выступаючыя выкрываюць пляны «чорнай зграі» на чале са «сьвятым айцом»—папаю рымскім.

Вось саматужнік — стары яўрэй выступае і гаворыць: «Я рэлігійны чалавек і ніхто мне ў гэтым не перашкадзе. Хто ўпоўнаважыў гэтых папоў, ксяндзоў і рабінаў уязьць над абарону нібы-та «прасьледваньне рэлігіі» ў СССР.

Нікому не дазволім перашкодзіць будаўніцтву сацыялізму. — заяўляюць ў сваёй рэзалюцыі працоўныя Койданава.

На пабудову эскадрыльлі самалёту „Рукі прэч ад СССР"

Уносяць і выклікаюць

У адказ на крыжовы паход усяго чорнага вараньня супроць Савецкага Саюзу зямляў працаўнікі Менакрэва т.т. Чарны і Літвер уносяць па 5 руб. кожны на пабудову эскадрыльлі «Рукі прэч ад Савецкага Саюзу» і выклікаюць наступных таварышоў: Рахуба, Гурыновіча, Маляўку, Бялугу, Валуева, Каплана, Шумеля, Паразінскага, Лук'янава, Дзятлава, Сьцяпанава, Скакуна, усіх супрацоўнікаў Барысаўскага РВК, т.т. Каранеўскага, Касабуцкага, Рыбакова, Стрэжа, Грыгарэнку, Шарко і ўсіх іншых супрацоўнікаў Менакрэва: каморнікаў, мэліяратараў, лесаўпарадчыкаў, агранамаў і г. д.

* * *

На выклік т.т. Чарнога і Літвера тав. Рахуба ўносіць 10 руб. і выклікае наступных т.т.: Сівянкова (Менакрэва—зямляўпарадчык), Батвіньніка (Менакрфа), Рубенчыка (Менакрэва — земляўпарадчык), Жалабновіча (Менакрфа), Маневіча (Менакрэва—зямляўпарадчык) і Сьцяпанава (намесьнік Менакрэва).

У ФОНД «НАШ АДКАЗ ПАПЕ ПІЮ XI»

Мы, пераменьніки—сапёры г. Менску, сабраўшыся для прахаджэньня трохдзённага навучальнага збору, у адказ на правакацыю чорнага вараньня на чале з рымскім папаю сабралі і ўносім у фонд «Наш адказ папе Пію XI» — 42 р. 27 к. Выклікаем рабочых і служачых менскіх прадпрыемстваў і ўстаноў.

Урадавы крызіс у Польшчы працягваецца

ППС урачыста абяцае не завастраць становішча

ВАРШАВА, 21. Старшыня сэнату Шымацкі вядзе далей перагаворы з сэймовымі фракцыямі аб стварэньні габінэту. Перагаворы пакуль што маюць «прынцыповы характар» і толькі ў панядзелак або аўторак Шымацкі мае намер канкрэтна заняцца пэрсанальным складам будучага габінэту. Ва ўрадавых і сэймовых колах да місіі Шымацкага не адносяцца сур'ёзна і разглядаюць яе хутчэй, як камэдыйны акт, які папярэджвае высоўваньне іншай сапраўды сур'ёзнай кандыдатуры, магчыма, таго-ж Бартэля. У апазыцыйных колах існуе апасеньне, што паўтараецца мінулагодняя гісторыя, г. зн., што сэсія будзе адтэрмінавана і назначэньне новага габінэту адбудзецца толькі ў часе парляманцкіх канікул.

Орган ППС «Роботнік» заяўляе, што левая апазыцыя адлае сабе справаздачу, што на адстаўку Пілсудскага, ад якога па сутнасьці ўсё залежыць, і разьлічваць ня прыходзіцца. З другога боку, апазыцыя ня хоча «катастрафічнага вырашэньня польскай унутранай праблемы». Выходзячы з гэтых меркаваньняў, «паводзіны апазыцыі будуць залежаць ад тактыкі маршала Пілсудскага». Іншымі словамі, ППС, як ужо было адзначана, дае ўрачыстае абяцаньне не завастрэць становішча, калі толькі ў будучы габінэт ня ўвойдуць падта правакацыйныя фігуры».

(«ИЗВЕСТИЯ»).

100.000 рабочых галадае ў Дамброўскім раёне

ВАРШАВА, 21. Карэспандэнт пэпэсаўскага «Роботніка» паведамляе, што паводле даных на 8 сакавіка, у Дамброўскім басэйне налічваецца каля 30.000 беспрацоўных і каля 20.000 рабочых, якія працуюць нялоўны тыдзень. Лік галадаючых рабочых разам з сем'ямі складае 100.000 чал. «Ніколі яшчэ, —піша карэспандэнт,—беспрацоўе і голад не дасягалі такіх страшэнных разьмераў». Карэспандэнт лічыць, што становішча рабочых у Дамброўскім басэйне яшчэ больш пагоршыцца, бо павінны адбыцца масавыя звальненьні на радзе сталеліцейных прадпрыемстваў.

Працэс украінскай контр-рэвалюцыі

Абвяргацелі з Варшавы

ХАРКАЎ, 21 сакавіка. Пры сканчэньні допыту Паўлушкава грамадзкі абвінаваўнік тав. Любчанка, зварачаючыся да Паўлушкава, гаворыць: «Я хачу паставіць вам адно пытаньне ў сувязі з тым, як даходзіць да некаторых чытачоў тое, што тут адбываецца. Вы ўчора хадайнічалі перад судом, каб зрабілі перарыў у сувязі з тым, што вы стомлены і ня можаце без перапынку працягваць свае паказаньні?»

Паўлушкаў.—Я прасіў суд і суд задаволіў маю просьбу.

Тав. Любчанка (зварачаючыся да падсудных Яфрэмава)—Падсудны Яфрэмаў, ці быў на працэсе такі выпадак: у мяне ў руках газэта «Новы Час», якая выходзіць у Львове, у нумары гэтай газэты ад 17 сакавіка буйнымі літарамі надрукавана, што «праф. Яфрэмаў пяць раз прасіў, каб спынілі слуханьне справы, бо ён стомлены адказамі на пытаньні, што працягваліся цэлы дзень, але суд адмовіў яму ў яго просьбе?»

Яфрэмаў.—«Гэтага ня было. Наадварот, калі я быў стомлены, суд задаволіў маю просьбу».

Праф. Гродзінскі (абаронца). — «Ад якога чысла?»

Тав. Любчанка.—«Ад 17 сакавіка 1930 году. Інфармацыя, відавочна, складзена да пачатку працэсу, а друкуецца зараз».

— Ці алкавалі вы, падсудны Яфрэмаў—працягвае тав. Любчанка—на пытаньне старшыні суду, як тут сказана: «праф. Яфрэмаў адказаў цьвёрдым выразным голасам: «Хочам незалежнай Украіны».

Яфрэмаў.—«Не, я так не адказваў». (Сьмех. Сьмяецца і падсудны Яфрэмаў).

Тав. Любчанка.—Наколькі я прыпамінаю—прашу або паправіць мяне, або згадзіцца—пасьля доўгага допыту мы прыйшлі да таго і вы так заявілі, што ваша работа ходам рэчаў прывяла-б не да залежнай Украіны, а да прыгнечанай Украіны. Іменна так вы адказалі і падзялілі сваю дзейнасьць.

Яфрэмаў.—Так, я гэта пацьвярджаю.

Тав. Любчанка.—Калі вас дапытвалі пракуратура і трамадзкае абвінавачаньне, вы расказалі, што атрымалі ліст ад Чыкаленкі, што гэты ліст вы чыталі на пасяджэньні «СВУ». Я прачытаю вам зараз з іншай газэты—«Дило», што выходзіць у Львове. Вы яе ведаеце?

Тав. Любчанка агалашае з львоўскай газэты «Дило» ад 15 сакавіка 1930 г. ліст з Варшавы украінскага эмігранта Чыкаленкі, у якім ён піша, што прачытаў у нумары 56 маскоўскіх «Известий» ад 26 лютага г. г. абвінаваўчы акт супроць «СВУ». У гэтым лісьце Чыкаленка піша: «Лічу сваім абавязкам пацьвердзіць, што ніякіх лістоў акадэміку Яфрэмаву ў 1926 годзе я ня пісаў. Адзіны і апошні ліст, які я паслаў акадэміку Яфрэмаву з-заграніцы, быў пасланы ў 1922 годзе. У гэтым лісьце я не закранаў ніякіх палітычных спраў і толькі пытаўся яго аб лёсе маіх архэалёгічных находак, якія засталіся ў Акадэміі Навук у Кіеве. Заяўляю, што гэтыя акалічнасьці я магу пацьвердзіць пад прысягаю, перад судом таго краю, дзе зараз жыву». (Сьмех у залі).

Тав. Любчанка пытаецца ў Яфрэмава, ці пацьвярджае ён, што ён атрымаў ліст ад Чыкаленкі.

Яфрэмаў.—Я пацьвяджаю, што атрымаў ліст ад Чыкаленкі ў 1926 г.

Тав. Любчанка.—І чыталі яго на пасяджэньні «СВУ?»

Яфрэмаў.—Так.

Тав. Любчанка.—Такім чынам гэта «абвяржэньне» Чыкаленкі не адпавядае сапраўднасьці. У газэтах ёсьць таксама ліст Садоўскага аб тым, што ў лісьце Чыкаленкі ня было яго запіскі. Ці гэта абвяржэньне не адпавядае сапраўднасьці?

Яфрэмаў.—Так.

Тав. Любчанка.—Такім чынам гэты ліст стымуляваў арганізацыю «СВУ», а зараз яго з Варшавы абвяргае Чыкаленка? Як вы лічыце, горад Варшава падыходзіць для Чыкаленкі, каб абвяргаць дакументы па справе «СВУ»? (Сьмех).

Яфрэмаў.—Так, падыходзіць.

Суд пераходзіць да допыту абвінавачанага Матушэўскага

Перад зрывам лёнданскай канфэрэнцыі

ФРАНЦЫЯ ЗГОДНА НА РАЗБРАЕНЬНЕ... ІТАЛІІ

БРЫЯН ПАКІНУЎ ЛЁНДАН

ЛЁНДАН, 20. Цэнтр цяжару морскай канфэрэнцыі перакінуўся ў сфэру адносін паміж Францыяй і Італіяй. Газэты наглят сьцьвярджаюць, што самы ключ канфэрэнцыі знаходзіцца ў руках Італіі. Італія, якая праявіла ўступлівасьць у пытаньні аб парытэце сваіх морскіх узбраеньняў з Францыяй, якая настойвае не на фактычнай, а толькі на тэарытычнай роўнасьці морскіх сіл, аднак, наўрад ці пойдзе на далейшае паслабленьне свае пазыцыі. Між тым, Францыя, прымушаная пахаваць сваё патрабаваньне новых гарантый, прабуе адыграцца іменна на Італіі. Як вядома, Францыя дала сваю згоду на памяншэньне першапачаткова патрабаванага танажу ў 714 тыс. да 650 тыс. тон. Сёньня стала вядома, што Францыя гатова пайсьці на наступную ўрэзку лічбы патрэбнага ёй танажу—да 600 тыс. тон пры ўмове, што розьніца паміж флётамі Францыі і Італіі будзе ня менш за 200.000 тон на карысьць Францыі. Французская делегацыя разам з гэтым рашуча адхіляе прынцып тэарытычнае роўнасьці французкага флёту з італьянскім.

Пазыцыя Францыі ўсё больш абрысоўваецца, як пазыцыя ўзрастаючага французкага імпэрыялізму, які заваёўвае сабе пануючае становішча на эўрапэйскім кантынэнце. Рыхтуючыся да будучага супэрніцтва з Англіяй, французкі імпэрыялізм імкнецца ў першую чаргу паслабіць свайго кантынэнтальнага канкурэнта—Італію.

Новае патрабаваньне Францыі ў сьвятле вядомай заявы Тардзье, што ён ня ўяўляе сабе вайны Францыі з Англіяй і Амэрыкай, цяпер набывае зусім канкрэтны сэнс падрыхтоўкі вайны супроць Італіі. Францыя пічыць за лепшае вывесьці са строю адзін ці два дзесяткі італьянскіх браняносцаў, крэйсэраў, зьнішчыцеляў і падводных лодак шляхам дыплёматычнай перамогі на канфэрэнцыі, чым выводзіць іх са строю ў парадку ваеннае перамогі на моры. Дыплёматычная перамога ня толькі будзе менш каштаваць, але і палегчыць будучую ваенную перамогу.

Англія, як відаць, схіляецца да часткова падтрыманьня патрабаваньняў Францыі, як кампэнсацыю за адмову ад міжземнаморскага Лёкарно і ад першапачатковых лічбаў танажу. Англія ня будзе падтрымліваць Італіі ў яе патрабаваньні тэарытычнай роўнасьці італьянскага флёту з французкім. Англія, адкак, не зацікаўлена і ў такім узмацненьні Францыі за кошт Італіі, якое зрабіла-б Францыю небясьпечным працінікам самое Англіі.

Закулісныя перагаворы працягваюцца.

* * *

ЛЁНДАН, 21. Пэрспэктывы морскай канфэрэнцыі 5-ці дзяржаў—самыя сумныя. Ад'езд Брыяна камэнтуецца друкам, як пачатак ракавога хаду канфэрэнцыі. Сам Брыян пры пасадцы на параход у Дуўры заявіў: «Якая карысьць у маім прабываньні ў Англіі і наглядзеньні праз вакно за добрым лёнданскім надвор'ем». Надзей на згоду 5-ці дзяржаў пры стварыўшыхся ўмовах ужо няма ніякіх.

Перад пачаткам палявых работ

ЗАСТАЛОСЯ НЕКАЛЬКІ РАШАЮЧЫХ ДЗЁН

Зруху-ж у падрыхтоўцы да сяўбы яшчэ няма

Цэнтр і месцы павінны неадкладна пераключыцца на сапраўды бальшавіцкія тэмпы працы

За сапраўдны баявы тэмп

(На пашы анай нададзе ў НКЗ БССР)

Зусім непарадкавай зьяўляецца адсутнасьць на месцах самых важных і натрабных інструкцыйных матар'ялаў. Высьвятляецца, што нават новы статут аб с.-г. арцелях, на які павінны заразжа перайсьці калгасы і які выклікае да сябе такую вялікую зацікаўленасьць з боку бядняцка-серадняцкага сялянства, на месцах ёсьць у нязначнай колькасьці і далёка не задавальняе попыту на яго. Аказваецца, што Белдзяржвыдавецтва друкавала статут на працягу 17 дзён, і яшчэ дагэтуль 30.000 экзэмпляраў статуту не разасланы на месцы.

Тое-ж самае становішча мы маем і з палажэньнем аб машына-конных станцыях. Ня толькі калгасы, але нават і саўгасы і каапэрацыйныя арганізацыі зусім не ўявілі сабе сутнасьці і задач машына-конных станцый. А Белдзяржвыдавецтва друкуе палажэньне аб машына-конных станцыях на працягу двух тыдняў. Вінаваты і Калгасцэнтр, які тут застаўся бездапаможным і ня мог знайсьці мер узьдзейнічаньня на наша выдавецтва, каб яно гэты заказ выканала самым хуткім і ўдарным парадкам.

«Гігантаманія» ў нас прыняла характар сапраўднай эпідэміі. Калі будуюць калгас, дык толькі на дзесятках тысяч гэктараў працягам... у 20-30 вёрст! Зусім ня ўлічваецца тая акалічнасьць, што мы яшчэ не ўладаем тэхнічнымі магчымасьцямі для абслугоўваньня такіх гіганцкіх калектыўных гаспадарак.

Тыя самыя каапэрацыйныя арганізацыі, якіх нядаўна трэба было сілком цягнуць, каб яны павярнуліся тварам да калектыўных гаспадарак, зараз заяўляюць: «мы—калгасныя арганізацыі—мы закліканы абслугоўваць калгасы, якая нам справа да індывідуальнага сэктару!» Гэта грубейшая памылка яшчэ не смяротная належнага адпору.

Пашырэньне с.-г. машын сярод індывідуальнага сэктару. Аказваецца, што рэалізаваны 61 акучнік, адна барана, і 4 сявяркі... Кантрактацыя пасеваў прайшла міма індывідуальнага сэктару. Нават кіраўнічыя работнікі і партыйцы на месцах рабілі грубейшыя промахі, разважаючы, «што нам індывідуальны сэктар! Заключым кантракты з калгасамі, а, калі што застанецца, тады ўжо падумаем аб індывідуальніках». Як зараз высьветлілася, Гомельская, Мазырская і Полацкая акругі зусім адмовіліся ад кантрактацыі пасеваў індывідуальнага сэктару. Тое-ж самае з кантрактацыяй жывёлы індывідуальнага сэктару—кантрактацыя буйное рагатае жывёлы зьведзена да нуля.

Крычаць—дайце трактароў—і ў той самы час нічога не зрабілі для збору задаткаў на трактары. У выніку гэтага памяншаецца колькасьць выдзеленых для Беларусі трактарных абавязацельстваў, што значна паменшыць завоз трактароў у БССР. Віна больш за ўсё падае на нашу каапэрацыю, якая, маючы вялікую разгалінаваную сетку і вялікі каапэрацыйны актыў, не павяла ніякай работы ў справе збору грошай на трактары. Частка адказнасьці тут кладзецца і на нашы пэфскія арганізацыі, якія не зацікавіліся гэтай справай. Уся ўвага, усе сілы павінны быць накіраваны зараз на падрыхтоўку да выхаду ў поле. Тут, у цэнтры, трэба скараціць да мінімуму колькасьць усялякіх пасяджэньняў і нарад, часта непатрэбных, якія адрываюць кіраўнічых і апэрацыйных працаўнікоў ад іх непасрэднай работы.

Л. Н—даў.

Зямляўпарадкаваньне калгасаў будзе скончана ў тэрмін

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Да апошняга часу зямляўпарадкаваньне калгасаў на акрузе ішло вельмі марудна. На 10-га сакавіка была вызначана плошча 50 проц. калгасаў. Пры правядзеньні зямляўпарадкаваньня быў дапушчаны рад скажэньняў лініі партыі—у некаторых месцах адводзілі пад калгасы ўсю зямлю, ня гледзячы на тое, што ў калгасы ўступілі ня ўсе беднякі і сераднякі. Зараз прымаецца рад захадаў, каб выправіць гэтыя скажэньні.

За апошні тыдзень зямляўпарадкаваньне калгасаў пасунулася ўперад, у раёнах працуюць 114 каморнікаў, пры актыўнай дапамозе мясцовых працаўнікоў. Да 1-га красавіка мяркуецца скончыць зямляўпарадкаваньне ўсіх калгасаў, арганізаваных да 15-га сакавіка.

Трэба адзначыць, што і зараз наглядаецца яшчэ скрыўленьне лініі партыі. Напрыклад, у Жлобінскім раёне былі выпадкі спыненьня зямляўпарадкаваньня тых калгасаў, дзе паводле новага статуту аб с.-г. арцелі калгасьнікі ўзялі ва ўласнае карыстаньне па адной карове.

Трэба моцна ўдарыць па тых, хто скажае лінію партыі і зрывае калгаснае будаўніцтва.

А. М.

Вынікі „гігантаманіі"

Практыка мясц сама па сабе яскрава давяла ўсю нямэтазгоднасьць захапленьня арганізацыяй калгасаў-гігантаў без належнай папярэдняй падрыхтоўчай працы. Полацкая округа, якая зьяўляецца, па сутнасьці, хутарскай округаю, таксама захапілася арганізацыяй архібуйных калгасаў, жадаючы «абагнаць» другія округі. У той час, як сярэдняя плошча калгасу па БССР складае 745 гэкт., па Полацкай акрузе гэтая плошча даходзіць да 860 гэктараў. І ў той час, як рабочая жывёла ў сярэднім па БССР абагулена на 39 проц., у Полацкай акрузе... толькі на 28 проц. Такое-ж становішча і са ссыпкаю насеньня. Цікава, што ў Полацкай акрузе, самай ільнаводнай у БССР, насеньня ільну ссыпана толькі... 6 проц.

Барацьба са шкоднікамі пасеваў

Вельмі часта павышэньню ўраджайнасьці і добрай ускожасьці засеваў у нас, у БССР, шмат перашкаджаюць розныя шкоднікі і хваробы с.-г. расьлін. Але нашы зямельныя арганізацыі слаба вядуць барацьбу са шкоднікамі.

Ня гледзячы на тое, што яшчэ ў мінулым годзе пры ўсіх акрэа БССР былі вызначаны штатныя пасады інструктароў па барацьбе са шкоднікамі, Бабруйскі, Аршанскі, Полацкі, Магілеўскі і Мазырскі акрэа аж да гэтага часу не патурбаваліся запоўніць гэтых пасад. Ва многіх мясцох барацьбу са шкоднікамі вядуць асобы, якія ў гэтым пытаньні зусім не кампэтэнтныя.

НКЗБ вызначыў цэлы рад спэцыялістых па барацьбе са шкоднікамі для округ, але апошнія чамусьці адмаўляюцца іх браць. Асабліва адстае ў барацьбе са шкоднікамі Бабруйскі акрэа. Між тым, у гэтай акрузе выяўлен шкоднік лугавы матыль, які паразіў каля 1000 гэкт. засеву.

Наогул, барацьба са шкоднікамі па округах вядзецца зусім дрэнна. Надыходзіць вясна. У сувязі з гэтым чакаецца масавае зьяўленьне розных палявых шкоднікаў і хвароб с.-г. расьлін, як напрыклад, лугавы матыль, які завёўся амаль ва ўсіх округах і заняў плошчу да 10.000 гэктараў. Калі ня прыняць супроць гэтага шкодніка свячасовых мер, то ён можа заразіць сотні тысяч гэктараў засеву. Хвароба яравых культур — сажа, аб якой ужо ня раз пісалася ў газэтах, з прычыны непратрачваньня насеньня, заразіла яшчэ больш насеньня. Ад яе летась загінулі тысячы пудоў збожжа. Шмат шкоды ад шкоднікаў і нашым садом і гародам. Ад іх гінуць цэлыя тысячы пудоў садавіны і гародніны.

Усё гэта сьведчыць нам аб тым, што ўжо зараз трэба прыняць самыя тэрміновыя меры для барацьбы з усімі гэтымі шкоднікамі. Трэба неадкладна камандзіраваць у округі спэцыялістых для барацьбы са шкоднікамі. Трэба падрыхтаванымі сустрэць напад шкоднікаў на нашы с.-г. засевы.

П.

Тармозяць рамонт

Машына-конныя станцыі на паперы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Ня гледзячы на набліжэньне веснавой сяўбы, справа з рамонтам с.-г. інвэнтару ў акрузе вельмі слаба пасоўваецца ўперад. Так, на 10 сакавіка па акрузе адрамантавана толькі 35 проц. машын. 80 рамонтных майстэрань, якія знаходзяцца ў калгасах, і 22 майстэрні саматужна-прамысловай каапэрацыі не нагружаны. На мясцох вельмі нядбайна і няўважліва адносяцца да рамонту с.-г. інвэнтару, асабліва раённыя калгасазоны і райвыканкомы. У раёнах займаюцца спрэчкамі, хто павінен рамантаваць с.-г. прылады: ці сыстэма акрэкалгасазову, ці сыстэма прамысловай каапэрацыі, а пакуль што 22 майстэрні прамысловай каапэрацыі нічога ня робяць. 179 тон гатункованага жалеза, якое атрымалі майстэрні прамысловай каапэрацыі, ляжыць без руху. 310 кавалёў гэтых майстэрань ходзяць без работы. Бываюць выпадкі, калі калгасазоны заказваюць прылады і на працягу некалькіх тыдняў іх не забіраюць. Так зрабіў Клімавіцкі райкалгасазоз. 500 адвалаў, заказаных ім, ужо на працягу двух тыдняў ляжаць у майстэрнях прамысловай арцелі. Да арганізацыі трох малых механічных майстэрань, вызначаных плянам, яшчэ ня прыступлена.

Вельмі дрэнна праходзіць па акрузе арганізацыя машына-конных калён. На 10 сакавіка арганізаваны ўсяго 24 машына-конныя калёны, замест вызначаных 197. Некаторыя раёны проста займаюцца «очковтирательством». Напрыклад, Шклоўскі райкалгасазоз 28-га лютага паведаміў у акругу, што па раёне арганізавана 18 машына-конных калён, а на 10 сакавіка даюцца весткі аб арганізацыі ўсяго 3-х калён. Чавускі раён 1-га сакавіка паведаміў аб арганізацыі 10 калён, а 10-га сакавіка паведамляе, што няма ні адной калёны.

Такога становішча в рамонтам с.-г. машын і арганізацыяй машына-конных калён па Магілеўшчыне далей цярпець нельга. Трэба зараз-жа вывяць вінаватых, якія тармозяць рамонт с.-г. машын і арганізацыю машына-конных калён.

А. С.

Пашырыць яравы клін БССР на 277.000 гэкт.

Намечаны плянам веснавой пасеўнай кампаніі яравы клін у разьмеры 2.333.000 гэкт. СНК павялічыў на 100.000 гэкт., што павінна такім чынам пашырыць яравы клін у параўнаньні з папярэднім годам ня менш, чым на 277 тыс. гэкт.

Гэта пастанова павінна быць ажыцьцёўлена шляхам пашырэньня саўгасаў на 6.000 гэкт., калгасаў — на 50.000 гэкт. і плошчы індывідуальных гаспадарак — на 44.000 гэкт. Прычым, пашырэньне павінна ісьці за кошт тых асноўных культур, якіх ёсьць у патрэбнай колькасьці. Галоўным чынам, бульбы, аўсу і ячменю. У выпадку недахвату гэтых культур засеў яравога кліну павінен рабіцца тымі культурамі, якія ёсьць на мясцох у пасеўшчыкаў.

СНК БССР запрапанаваў акруговым, раённым выканаўчым камітэтам, сельскім саветам, каапэрацыйным і грамадскім арганізацыям неадкладна правесьці шырокую растлумачальную кампанію ў калгасах і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках за паказаныя пашырэньні пасеўных плошчаў, зьвярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на растлумачэньні тых ільгот пры пашырэньні пасеўнай плошчы, якія прадугледжаны пастановай ураду аб с.-г. падатку для калгасаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак за пашырэньне плошчы.

Агляд міжзборавай работы

ПАВЫСІЦЬ ВАЕННУЮ ПАДРЫХТОЎКУ НАЧСКЛАДУ ЗАПАСУ

У рабоце з начальніцкім складам запасу вялікае месца павінен займаць дом Чырвонай арміі. Сёе-тое ім і пароблена, але гэтага, вразумела, мала. У студзені месяцы была склікана канфэрэнцыя начскладу запасу з пытаньнямі аб іх удзеле ў рабоце дому Чырвонай арміі.

Гэта канфэрэнцыя дала свае вынікі. Начсклад запасу наблізіўся да дому Чырвонай арміі, павялічылася колькасьць членаў ДЧА за лік начскладу запасу і яны адпольська, як і кадравы камсклад, запрацаліся на ўсе лекцыі прафэсароў вайсковай акадэміі, якія былі ў Менскім гарнізоне.

Лекцыі т. т. Гая, Сьвечына, Горава і іншых для начскладу запасу мелі вялікае значэньне.

Усю зіму рэгулярна ў пяцідзёўку праводзіўся інструктаж тых з асоб начскладу запасу, хто вядзе работу ў вайсковых гурткох на фабрыках і заводах.

Была наладжана кансультацыя па ўсіх асноўных пытаньнях вайсковай работы, асабліва мэтодыкі і г. д.

Масавая работа ДЧА каардынуецца з ЦС Асоавіяхімам і разам з цэнтральным саветам праправодваліся пытаньні прыцягненьня начскладу да работы ДЧА.

Разам з ЦС Асоавіяхіму ДЧА правёў завочнае вырашэньне тактычных задач па Беларусі, вгодна матар'ялаў прысланых з цэнтральнага дому Чырвонай арміі. Было разаслана 375 задач з картамі і мэтадычнымі паказаньнямі ўсім катэгорыям начскладу запасу. Зьвыш 200 задач ЦДЧА з Беларусі атрымаў.

У Менску таксама ДЧА правёў гульню начскладу запасу на вырашэньне тактычных задач.

Да гадавіны Чырвонай арміі быў праведзен конкурс па стральбе з нагана і дробнакаліберной вінтоўкі, дзе брала ўдзел 25 чал. начскладу запасу.

Але ўсяго гэтага мала. Пры вялікай увазе да работы з начскладам запасу можна было-б прарабіць вялікую работу.

У бліжэйшы-ж час дом Чырвонай арміі рыхтуецца да таго, каб яшчэ больш прыцягнуць начсклад запасу да непасрэднага ўдзелу ў рабоце ДЧА.

У прыватнасьці 21 і 22 сакавіка праходзіла канфэрэнцыя начскладу запасу, якая павінна зрабіць пералом у справе іх прыцягненьня да работы ДЧА.

Ва ўсёй сваёй рабоце з начскладам запасу ДЧА павінен павышаць іх ваенныя і ваенна-палітычныя веды, палепшыць абслугоўваньне, наладзіць інструктаж, стварыць з іх добрых кіраўнікоў вайсковых гурткоў на прадпрыемствах, праваднікоў ідэй ваяннізацыі насельніцтва.

Трэба зьнішчыць такі прабел, як адрыў ДЧА ад 2-й дывізіі, якая працуе з большасьцю начскладу запасу праводзіць зборы і г. д.

Асабліва трэба будзе наладзіць сувязь ДЧА з 2-й дывізіяй у часе збораў, тут віна і падзіву 2, які не даволі падштурхоўвае ДЧА, каб ён палепшыў сваю работу з начскладам запасу ў пэрыяд міжзборавай работы і асабліва ў часе самых збораў, дзе ДЧА трэба наладзіць культурнае абслугоўваньне начскладу запасу.

Надыходзячы летні пэрыяд патрабуе ад ДЧА такое пастаноўкі справы, каб кожны камандзір запасу, асабліва кіраўнік гуртка на фабрыцы і заводзе, атрымаў добры, рэгулярны інструктаж і паладзіў-бы выхады ў поле, тактычныя заняткі, г. зн. вдолеў-бы скарыстаць летнія ўмовы для павышэньня тактычнай вывучкі членаў гуртка.

ДЧА павінен дапамагчы і прафсаюзам наладзіць масавыя выхады ў поле з тактычнымі заняткамі для чаго праводзіць і наладзіць інструктаж і кансультацыі па прафсаюзных клюбах.

Да гэтай работы ДЧА рыхтуецца і гэтыя задачы ён выканае.

У прыватнасьці ДЧА арганізуе курсы Аўтадору з шырокім прыцягненьнем начскладу запасу з тым, каб навучыць іх разумець матор і ўмець ім кіраваць.

Усё гэта разам забясьпечыць непасрэдны ўдзел начскладу запасу ў рабоце ДЧА, павялічыць яго веды і палепшыць яго абслугоўваньне з боку ДЧА.

Брыгада «Зьвязды».

Перавыбары парторганаў

У ЧАСЕ ПЕРАВЫБАРАЎ

ГРАВЕРЫМ КІРАЎНІЦТВА ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

БАРАЦЬБОЙ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Палітычнае значэньне перавыбараў

Бюро калектыву БДУ ня выканала дырэктывы ЦК

Перавыбары бюро партыйных ячэек у **Белдзяржунівэрсытэце** праходзяць пездавальняюча. Гэта палітычная кампанія амаль не адчуваецца ва унівэрсытэце.

На перавыбарчых сходах ня знойдзеш беспартыйных студэнтаў. Перавыбарчы сход у ячэйцы **праўгасу** прышлося адкласьці, бо на сход ня прышлі ня толькі беспартыйныя студэнты, але і партыйцы. У другі раз сход пачаўся са значным спазьненьнем. Але і на гэтым сходзе з 110 камуністых прысутнічала толькі 70. Перавыбарчы сход у ячэйцы **мэдфаку** пачаўся са спазьненьнем на 2 гадзіны пры адсутнасьці беспартыйных студэнтаў і значнай часткі камуністых.

Асноўнай прычынай зрыву перавыбарных сходаў зьяўляецца адсутнасьць усякай падрыхтоўчай работы. Бюро калектыву толькі вызначала тэрміны перавыбараў, але не дало ніякіх практычных указаньняў аб правядзеньні падрыхтоўкі.

Ячэйкі не прапрацавалі дырэктыўнага ліста ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў. Ва унівэрсытэце абсалютна нічога ня зроблена ў выкананьні дырэктывы ЦК аб «максымальным прыцягненьні партыйнай масы і ў першую чаргу партактыву да праверкі работы кіраўнічых органаў». Справаздачы на бюро ячэек не абмяркоўваліся. У насьцепгазэтах ня было ні аднаго артыкулу па пытаньні перавыбараў.

Да перавыбараў бюро ячэек меркавалася правесьці рэарганізацыю структуры і сыстэмы работы партыйнага калектыву Белдзяржунівэрсытэту. Павінны былі быць арганізаваны інстытуты партарганізатараў у акадэмічных групах, створаны ячэйкі на аддзяленьнях, зроблен пераход на сэктарна-вучастковую сыстэму працы і г. д. Але ніякай растлумачальнай работы па пытаньні рэарганізацыі не праведзена. Партыйная маса унівэрсытэту нават не абмеркавала гэтага пытаньня. У паняўнасьці рэальная пагроза зрыву рэарганізацыі.

Выбары партыйных арганізатараў і бюро ячэек па аддзяленьнях былі праведзены фармальна. У часе перавыбараў зусім ня была завострана ўвага на мэтах рэарганізацыі. Ня дзіва, што зараз ячэйкі па аддзяленьнях і партгрупы ня ведаюць, як разгарнуць работу. Ня варта гаварыць, зразумела, што беспартыйнае студэнцтва нічога ня ведае аб рэарганізацыі партработы.

Справаздачныя даклады сваім зьместам былі далёка нездавальняючымі. Рад важнейшых задач, што стаяць заразперад вузаўскімі ячэйкамі, не знайшоў патрэбнага адлюстраваньня ў справаздачах. У справаздачы бюро ячэйкі **праўгасу** зусім ня была завострана ўвага на такіх асноўных пытаньнях, як сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарны рух. Між тым, на факультэце сапспаборніцтва не разгорнута. У справаздачы ня было ні аднаго слова наконт беларусізацыі. І гэта ў той час, калі нядаўна ЦК КП(б)Б абвясьціў вымову бюро ячэйкі праўгасу за дрэнную работу па беларусізацыі. Таксама нічога ня было сказана ў справаздачы аб тым, як рэалізуюцца прапановы камісіі па праверцы ячэйкі.

Бюро ячэек і парткалектыву не зрабілі належных захадаў, каб забясьпечыць шырокі ўдзел камуністых у спрэчках па справаздачных дакладах. Сакратар бюро калектыву тав. **Эпштэйн** бяз ведама бюро даў указаньні ўсім сакратаром ячэек: справаздачна-перавыбарчыя сходы абавязкова скончыць у адзін вечар. Сакратару ячэйкі **праўгасу** тав. **Эпштэйн** даў дырэктыву: «скарачацца і хутчэй праводзіць перавыбарчы сход». У выніку, на сходзе ячэйкі праўгасу спрэчкі былі змазаны. Запісаліся ў спрэчках 22 чалавекі, а выступіць мелі магчымасьць толькі 10.

У сьвятле гэтых фактаў нас зусім ня зьдзіўляе слабое разгортваньне самакрытыкі на справаздачна-перавыбарчых сходах. Прадстаўнік райкому т. **Лазоўскі** на сходзе партыйнай ячэйкі мэдфаку так ацаніў справаздачны даклад і спрэчкі: «Самакрытыка не насіла зубастага характару».

Спрэчкі ня былі ўзьняты на палітычную вышыню, ня былі зьвязаны з агульна-партыйнымі задачамі, а былі прасякнуты вузкім практыцызмам. Ні ў справаздачы, ні ў спрэчках ня было закранута пытаньне аб палітычных памылках бюро **Кастрычніцкага РК**, асуджаных бюро **Менскага АК КП(б)Б**. Ні аднаго слова ня было сказана аб рабоце бюро парткалектыву БДУ.

Такое-ж становішча мела месца і на іншых сходах факультэцкіх парт'ячэек.

***

Зусім відавочна, што ў Белдзяржунівэрсытэце змазана палітычнае значэньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Бюро парткалектыву БДУ ня ўлічыла памылак Кастрычніцкага РК. Вінаватыя ў недапушчальна нядбайных адносінах да важнейшай палітычнай кампаніі павінны быць прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасьці.

Ш. Г.

Факты і лічбы, якія сыгналізуюць

МАЦНЕЙ УДАРЫЦЬ ПА КАМУНІСТЫХ «ХВОСЬЦІКАХ»

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) абавязаў «усе партыйныя арганізацыі накіраваць свае намаганьні на тое, каб забясьпечыць пагалоўны ўдзел камуністых і камсамольцаў ва ўдарных брыгадах».

Наколькі партыйныя арганізацыі выконваюць гэту важнейшую дырэктыву ЦК і на справе кіруюць сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарным рухам?

Калектыў КП(б)Б швэйнай фабрыкі **«Кастрычнік»** (Менск) сыстэматычна кіруе спаборніцтвам. Парткалектыў аказвае кіраўнічую дапамогу ўдарным брыгадам. Бюро калектыву і фракцыя фабрычных прафоргана ў хутка і выразна рэагавала на выпадкі недапушчальных адносін асобных камуністых і камсамольцаў да вытворчасьці.

На **абутковай фабрыцы** (Менск) усе камуністыя і камсамольцы ўступілі ва ўдарныя брыгады. Партыйцы першымі падалі заявы аб зьніжэньні расцэнак і павялічэньні норм выпрацоўкі. Добра настаўлена парткіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам па фабрыцы імя **Клары Цэткін** (Віцебск).

Але далёка яшчэ ня ўсе парткалектывы выразна выконваюць дырэктыву ЦК аб пагалоўным удзеле камуністых і камсамольцаў ва ўдарных брыгадах. Ёсьць яшчэ значная колькасьць заводаў і фабрык, дзе партыйнае кіраўніцтва спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі пастаўлена вельмі дрэнна.

Парт'ячэйка **Бабруйскага лесазаводу** не аддае ніякае увагі ўдарным брыгадам. Партыйцы сваімі адносінамі да вытворчасьці нічым не адрозьніваюцца ад беспартыйных рабочых. На **Бабруйскай мэблевай** фабрыцы няма ніякага парткіраўніцтва ўдарным рухам. Частка камуністых фабрыкі адмовілася прыняць выклік беспартыйных рабочых па сацыялістычнае спаборніцтва.

Недапушчальна адносіцца да спаборніцтва бюро парткалектыву ст. Віцебск МББ чыг. У мінулым годзе бюро парткалектыву зусім не кіравала сапспаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі. 600 камуністых членаў калектыву ня прымалі ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве. Ва ўдарных брыгадах было толькі некалькі партыйцаў. Камуністыя адмаўляліся змагацца з прагуламі і вытворчай расхлябанасьцю. Частка партыйцаў адкрыта абараняла злосных парушальнікаў працоўнай дысцыпліны. Парткіраўніцтва калектыву ў пытаньнях сапспаборніцтва праводзіла прымірэнчую, апартуністычную лінію, не змагаючыся з хвасьцістымі і дэзэртырамі з працоўнага фронту, не рэагуючы на адмаўленьне членаў партыі ўступаць ва ўдарныя брыгады.

Гэтыя буйнейшыя прарывы былі адзначаны яшчэ ў лістападзе 1929 г. Тады-ж бюро калектыву ўхваліла рашучую пастанову па выпраўленьні дапушчаных прарываў. Але пастанова бюро засталася на паперы. Становішча ў парткалектыве амаль не зьмянілася. Бюро калектыву, як і раней, ня кіруе сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі. Як і раней, многія партыйцы ня прымаюць ніякага ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве. **У цэх'ячэйцы № 10** менш 50 проц. камуністых уступілі ва ўдарныя брыгады. Фракцыя чыгуначнай прафсаюзнай арганізацыі ня кіруе спаборніцтвам.

На заводзе **«Энэргія»** (Менск) з 146 камуністых, толькі 87 зьяўляюцца ўдарнікамі. На Віцебскай гарбарні ва ўдарных брыгадах ёсьць толькі 50 проц. парткалектыву. На фабрыцы **«Дзьвіна»** з 200 камуністых ва ўдарных брыгадах прымае ўдзел толькі 73 чал.

Наступныя лічбы выразна сьведчаць аб тым, наколькі некаторыя парткалектывы нездавальняюча выконваюць дырэктыву ЦК партыі. На 73 заводах і фабрыках Беларусі працуюць 4.702 партыйцы. З гэтага ліку прымаюць удзел у спаборніцтве толькі 78 проц.

На 70 прадпрыемствах, на якіх працуе 4.613 партыйцаў, на 1 лютага толькі 2.860 камуністых уступілі ва ўдарныя брыгады.

Такое становішча недапушчальнае. Не павінна быць ні аднаго камуністага, ні аднаго камсамольца па-за ўдарнымі брыгадамі. Трэба рубам паставіць пытаньне перад тымі партыйцамі, якія ўнікаюць удзелу ў спаборніцтве і адмаўляюцца ўступаць ва ўдарныя брыгады. Зусім ясна, што адмову члена партыі ўступіць ва ўдарныя брыгады і прымаць удзел у сацыялістычным спаборніцтве нельга інакш кваліфікаваць, як выразнае праяўленьне правааапартуністычнага ўхілу на практыцы. Таму партыйныя ячэйкі павінны жорстка змагацца з камуністымі-«хвосьцікамі», з тымі, хто пягнецца ў хвасьце і дэзэртыруе з фронту сацыялістычнага спаборніцтва.

Разгорнутую справаздачна-перавыбарчую кампанію парторганаў трэба поўнасьцю скарыстаць для шырокай праверкі работы партыйных калектываў на кіраўніцтве сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі. Перавыбары парторганаў павінны паказаць, наколькі бюро партыйных калектываў выконваюць дырэктыву ЦК аб удзеле камуністых ва ўдарных брыгадах, наколькі бюро пабальшавіцку кіруюць сацыялістычным спаборніцтвам, наколькі яны сталі па чало творчай актыўнасьці рабочых мас.

С. Ш.

У ПАРТЫЮ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). На заводзе па пабудове і рамонце чыгуначнага рухомага складу імя Ланцуцкага 26 ІНЖЫНЭРАЎ І ТЭХНІКАЎ, на чале з галоўным інжынэрам заводу, падалі заяву аб уступленьні ў партыю.

На гэтым-жа заводзе мэханічны цэх у поўным складзе калектыўна заявіў аб сваім жаданьні ўступіць у партыю.

Г.

Яшчэ аб апартуністычнай пастанове Шклоўскага РК КП(б)Б

Кулацтва прабуе ў сваёй агітацыі супроць калгаснага будаўніцтва выкарыстаць апошнія партыйныя пастановы, як адступленьне назад ад палітыкі калектывізацыі. Падгалоскамі кулака ў гэтай справе зьяўляюцца правыя і «левыя» апартуністычныя элемэнты ў радох нашае партыі. Тое, што адбылося ў Шклове гэтымі днямі, як нельга больш характарызуе гэты стык паміж імкненьнямі кулака і настроямі правых і «левых» апартуністых.

Бюро Шклоўскага райкому партыі, абгаворваючы пытаньне аб артыкуле тав. Сталіна «Головокружение от успехов» і новы статут сельска-гаспадарчай арцелі, замест таго, каб маблізаваць партыйную арганізацыю і батрацка-бядняцка-серадняцкія масы вёскі на выкананьне задач, пастаўленых партыяй у галіне далейшага замацаваньня калгаснага руху, заняло яўна няправільную, антыпартыйную пазыцыю.

Бюро РК была прынята пастанова, у якой яно імкнулася апраўдаць свае памылкі ў кіраўніцтве калгасным рухам (практыку адміністраваньня, прымусовага абагульваньня) тым, што «партарганізацыя да апублікаваньня дырэктывы аб пакіданьні аднае каровы ў індывідуальным карыстаньні ня была інфармавана вышэйшымі партарганізацыямі, што павяло да раду непаразуменьняў і дало магчымасьць кулацтву выкарыстаць гэта і выклікала самавольства ў паасобных вёсках па лініі разбору жывёлы» (пункт 6 пастановы РК КП(б)Б ад 6 сакавіка).

Прыняцьце гэтае пастановы папярэджвалі адкрытыя апартуністычныя выступленьні некаторых членаў бюро РК супроць генэральнай лініі нашае партыі, якая знайшла сваё адлюстраваньне ў артыкуле тав. Сталіна і ў пастанове ЦК УсеКП(б). Член бюро РК Астапенка дагаварыўся да таго, што заявіў: «ЦК УсеКП(б) зрабіў грубейшую палітычную памылку, надрукаваўшы сваю пастанову і артыкул тав. Сталіна ў газэтах без папярэдняй рассылкі (?!) матар'ялаў мясцовым партыйным арганізацыям».

Сапраўдную прыроду гэтых выступленьняў, а таксама і пастановы бюро РК раскрыў на сходзе шклоўскага партактыву старшыня шклоўскага РВК Асмалоўскі, які заявіў, што «без адміністраваньня нельга праводзіць калектывізацыю, нельга замацоўваць калектывізаваных гаспадарак». У гэтым выступленьні шклоўскі унтэр-прыпыбеей найбольш поўна выявіў свой уласны твар.

У часе масавага добраахвотнага руху мільёнаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калектывы, у часе вялікарэйшай работы партыі па сацыялістычнай перабудове вёскі, у час бязьлітаснай барацьбы з кулацтвам, якое шалёжа быць ацэнена толькі як выступленьне ворага.

Трэба адзначыць, што гэтаму выступленьню ні на бюро райкому, ні на сходзе партактыву ня было дана належнага адпору. Наадварот, некаторыя члены шклоўскага партактыву цалкам падтрымалі гэтае выступленьне. Рабфаўца—загадчык фінчасткай РВК,—напрыклад, заявіў, што «дасягненьні ў галіне калектывізацыі разбураюцца не па нашай віне, а па віне вышэйшых партыйных арганізацый».

Мы ня будзем тут падаваць другіх выступленьняў удзельнікаў сходу партактыву. Адзначым толькі, што член бюро АК тав. Зэльдовіч, які прысутнічаў на актыве, каторы ведаў аб апартуністычнай пастанове бюро Шклоўскага райкому, зусім не рэагаваў на яе, ня даў ёй належнай палітычнай ацэнкі. Зусім не павінна нас дзівіць, што ў выніку такіх настрояў кіруючай верхавіны Шклоўскага раёну мы маем развал раду калгасаў у раёне, амаль поўную адсутнасьць работы з беднатой і батрацтвам, дрэнную падрыхтоўку да сяўбы. Апартуністыя са Шклоўскага РК КП(б)Б зьяўляліся і зьяўляюцца, чымбы яны не жадалі ад гэтага абараніцца, тормазамі калгаснага руху на Шклоўшчыне.

Зусім ясныя і выразныя дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб барацьбе са скрыўленьнямі ў калгасным руху бюро Шклоўскага РК імкнулася падаць як перашкоду калгаснаму будаўніцтву. Сумесна з кулаком шклоўскія апартуністыя імкнуліся вытлумачыць апошнія пастановы партыі, як адступленьне назад.

ЦК УсеКП(б) у сваёй апошняй пастанове падкрэсьлівае, што скрыўленьні лініі партыі могуць толькі «стварыць базу для ўзмацненьня правых элемэнтаў партыі». Гэтай справе і служыць нежаданьне Асмалоўскіх і К-о весьці барацьбу з перагібамі, жаданьне працягваць адміністраваньне. Замест таго, каб адраду перайсьці ў калгасах на новы стат тут, замест таго, каб на этэ аснове замацаваць калгасы, шклоўскае парткіраўніцтва пайшло па іншым шляху, па шляху абароны сваіх памылак, перагібаў, увядзеньня іх у сыстэму, па шляху паклёпаў на кіраўніцтва бальступленьня супроць генэральнай лініі нашае партыі.

Партыя моцна ўдарыць па правых і «левых» апартуністых партыя на дазвоабвостранай клясавай барацьбы Асмалоўскім і іншым праводзіць спакойна сваю антыпартыйную, шкодніцкую работу.

Бюро Шклоўскага РК павінна быць неадкладна адноўлена, пераабрана. На вуроках гэтых шклоўскіх спраў трэба прасярод членаў шклоўскай і іншых ённых арганізацый. Магілеўскі акругком ня правяў у гэтым выпадку блізарукасьць, не рэагаваўшы зараз-жа на апартуністычную пастанову Шклоўскага РК.

Магілеў.

М.

ЗА БАЯВЫЯ, УДАРНЫЯ ТЭМПЫ

Парт'ячэйкі і кіраўнікі ўстаноў павіны ўзмацніць беларусізацыю

Агонь па вялікадзяржаўных шавіністых, якія імкнуцца сарваць беларусізацыю

За невыкананьне партыйных дырэктыў—да адказнасьці

У матар'ялах нацкамісіі ЦВК па праверцы беларусізацыі ўстаноў хіба-ткарным зьяўляецца тое, што там, дзе кіраўнікі самі ўжываюць беларускую мову, энэргічна праводзяць беларусізацыю, там і ўстанова беларусізавана; там, дзе кіраўнікі нядбайна адносяцца да беларусізацыі, самі не ўладаюць беларускай мовай, даючы гэтым повад іншым працаўнікам, там беларусізацыя праводзіцца слаба.

Найлепшым прыкладам гэтага можа зьявіцца стан беларусізацыі ў Цэнтральнай Статыстычнай Управе ў Менску. Былы кіраўнік ЦСУ Праферансаў на запытаньне нацкамісіі ЦВК аб прычынах зрыву беларусізацыі, піша: «асабліваасьць работы асноўнай масы супрацоўнікаў, якія, будучы занятымі толькі пералічэньнем лічбаў, пазбаўлены магчымасьці практыкавацца і навышаць якасьць ведаў па беларускай мове». Гэтыя спасыланьні «на асаблівасьці работы» і сталі вынікам «асаблівай» пастаноўкі работы на беларусізацыі ў ЦСУ, аб якасьці якое можа сьведчыць факт зьняцьця з работы за зрыў беларусізацыі кіраўніка ЦСУ Праферансава.

І цяпер толькі, у сувязі з пастановай ЦК КП(б)Б, адчуваецца некаторы зрух у бок ужываньня беларускай мовы. У ЦСУ ўзьнята кампанія за беларусізацыю ў пасьцегазэце, праводзяцца выклікі цэлых сэктараў і аддзелаў на павышэньне якасьці беларускай мовы. Кожны супрацоўнік ЦСУ імкнецца гаварыць толькі пабеларуску. Але ўсё-ж трэба сказаць, што рэцыд

Каапэрацыйныя арганізацыі мала клапацяцца аб кантрактацыі гародніны

З кожным днём набліжаецца сяўба. Падрыхтаванасьць агародных калгасаў да пасеўнай кампаніі зусім не дзе ўпэўнена, што намечаныя пляны пасеву гародніны будуць з посьпехам выкананы.

Да гэтага часу ніякіх зьмен у сэнсе паляпшэньня забесьпячэньня агародаў насеньнем няма. Садкалгассаюз, які абяднае усе агародныя калгасы, на сёньшні дзень забясьпечаны насеньнем усяго толькі на 50 проц. патрэбнай колькасьці.

Ня лепшае становішча і ў агародах Цэрабкопаў.

Трэба адзначыць, што Садсаюз і мясцовыя арганізацыі вельмі мала аддалі ўвагі пытаньню адшуканьня насеньня ў саміх калгасах, пытаньню мабілізацыі насеньня ў насельніцтва. Мясцовыя арганізацыі абавязаны ў найхутчэйшым тэрмін вывяўць і скарыстаць усе свае мясцовыя рэсурсы насеньня. Да гэтага часу яшчэ мала зварачаецца ўвагі на стварэньне абагуленых фондаў агароднага насеньня.

Дрэнная таксама справа з забесьпячэньнем калгасаў інвэнтаром. Садсаюз забясьпечан толькі на 16 проц. патрэбнага паводле пляну інвэнтару. Не хапае сяўрак, рыхліцеляў як конных так і ручных, і дробнага інвэнтару.

У нашых умовах, калі каапэрацыя мала не разгортвае сваёй сеткі каапэрацыйных агародаў і існуючыя каапэрацыйныя агароды далёка не могуць задаволіць патрэб насельніцтва ў гародніне, кантрактацыя прадукцыі калгасных агародаў набывае асабліва важнае значэньне.

Весткі аб ходзе кантрактацыі сьведчаць аб тым, што мясцовыя арганізацыі і каапэрацыя да гэтага часу вельмі мала ўвагі аддалі гэтаму важнейшаму пытаньню, сьведчаць аб небясьпечным стане кантрактацыі.

На 15 сакавіка плян кантрактацыі па БССР выкананы толькі на 73,6 проц.

Некаторыя акругі амаль што зусім не прыступілі да кантрактацыі агародняй прадукцыі. Так, Мазырская акруга выканала толькі 11,2 проц. пляну кантрактацыі, Полацкая — 19,4 і г. д.

Каапэрацыйныя арганізацыі павінны зараз паставіць сваёй задачай дабіцца поўнага выкананьня намечаных пляноў засеву агародных калгасаў і поўнага выкананьня пляну кантрактацыі.

Беларабсэкцыя зьвярнулася да ўсіх цэрабкопаў з прапановай неадкладна вылучыць спэцыяльныя рабочыя брыгады для праверкі і дапамогі калгасам падрыхтавацца да засеву агародаў. Брыгады павінны прыняць удзел у складаньні рабочых пляноў калгасаў, дабіцца атрыманьня насеньня і інвэнтару, якіх яшчэ не хапае ў калгасах.

Весткі з раду раёнаў гавораць аб тым, што мясцовыя арганізацыі да гэтага часу яшчэ не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці разьвіцьця агароднічтва і аддаюць гэтаму пытаньню вельмі мала ўвагі. Рабочыя брыгады павінны вывяўць тых, хто зрывае і перашкаджае агародным калгасам выкананьню сваё пасеўнай кампаніі.

А.

Яўрэйскую местачковую беднату — да вытворчай, карыснай працы

(З дакладу т. Рачыцкага на пленуме АЗЕТ)

На апошнім пленуме савету і праўленьня Белазету з дакладам аб задачах зямляўпарадкаваньня яўрэйскага працоўнага насельніцтва выступіў наркамзем БССР тав. Рачыцкі.

Падаем у кароткіх нарысах зьмест дакладу тав. Рачыцкага.

— У БССР за апошнія гады была праведзена вялікая работа па зямляўпарадкаваньні яўрэйскай беднаты. Зямляўпарадкавана звыш 9 тыс. сем'яў, або 40 тыс. чалавек на плошчы ў 60 тыс. гэктараў.

Усе гэтыя землі зараз ужо пераведзены на калектыўныя формы зямлякарыстаньня.

Побач з зямляўпарадкаваньнем праводзілася работа па ўпарадкаваньні мястэчак, на якую было выдана каля 10 мільёнаў рублёў.

Як праводзілася гэта работа, ці адказвае яна тым устаноўкам і тым задачам, якія перад намі стаяць? У рабоце па зямляўпарадкаваньні быў дапушчаны рад грубых памылак. Упарадкавалася наогул «яўрэйская насельніцтва», а не яўрэйская беднота, аб якой мы павінны клапаціцца ў першую чаргу. Займаліся работай па ўпарадкаваньні мястэчак наогул, а не аб паляпшэньні жыцьця местачковых беднякоў. Гропы выдаваліся на розныя мэты, якія зусім не адпавядаюць тым задачам, што ставяцца партыяй перад намі.

У выніку, мы вымушаны ў гэтым годзе праводзіць чыстку тых яўрэйскіх сельска - гаспадарчых аб'яднаньняў, якія арганізаваліся на тэрыторыі БССР, бо яны засьмечаны чужым элемэнтам, які знутры зрывае работу калгасу.

Але праводзячы чыстку сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў ад чужога эксплёататарскага элемэнту, як яўрэйскай так [illegible] паны, мы павінны рашуча змагацца і з перагібамі ў гэтых адносінах, з «левымі заскокамі», якія закранаюць серадняка, працоўнага рамесьніка, якія граюць толькі на руку варожым элемэнтам. Мы лічым, што да сельскай гаспадаркі, да вытворчасьці трэба прыцягнуць яўрэйскіх беднякоў — тых былых дробных гандляроў, якія не карысталіся наёмнай працай, хоць-бы яны і ня мелі выбарных праў. Цельта махавічна падыходзіць да гэтага пытаньня: калі «лішэнец», значыць, яго трэба вычышчаць з аб'яднаньня або саматужна-крамысловай арцелі.

Работа, якую мы павінны зрабіць у бліжэйшы час, зусім адрозьніваецца ад тай, якую мы праводзілі дагэтуль у галіне зямляўпарадкаваньня яўрэйскай беднаты. Зараз ставіцца пытаньне аб шырокім уцягненьні яўрэйскай беднаты мястэчак і гарадоў у працэс сацыялістычнага будаўніцтва. Працоўная беднота павінна быць уключана ў сыстему с.-г. каапэрацыі шляхам арганізацыі калектыўных гаспадарак, папаўненьня суседніх калгасаў яўрэйскай беднатой, арганізацыі саматужна - прамысловых арцеляй у калектыўных гаспадарках, якія адчуваюць патрэбу ў рамесьніках. Адначасова трэба арганізаваць як мага больш пэўшкаводных гаспадарак, асноўнай базай якіх павінны зьявіцца нашы мястэчкі. Пэўшкаводныя гаспадаркі могуць значна палепшыць жыцьцё шырокіх мас яўрэйскай працоўнай беднаты нашых мястэчак і гарадоў.

Ня менш важная задача — уцягнуць у вытворчую працу, на прамысловыя прадпрыемствы — местачковую працоўную моладзь. Нам патрэбны дзесяткі тысяч майстроў у сельскай гаспадарцы па масла - сыраварнай, па садова - агароднай справе, па жывёлагадоўлі і г. д. Мястэчкі павінны зьявіцца рэзэрвуарам для падрыхтоўкі кадраў с.-г. тэхнікаў-спэцыялістых. Значнае колькасьці рабочых рук патрабуюць новыя сагасы «Вернитрэсту», якія арганізуюцца на мэліяраваных [illegible] болотах.

У гэтым годзе мы [illegible] ад тай формы зямляўпарадкаваньня, якая праводзілася ў мінулыя гады. Зараз ня будзе праводзіцца спэцыяльны адвод зямлі для яўрэйскай местачковай беднаты. Мястэчкі ўключаюцца ў адзіны плян зямляўпарадкаваньня і калектывізацыі. Там, дзе мясцовыя арганізацыі ўзяліся за гэтую справу, мы маем станоўчыя вынікі.

Узьнікае пытаньне, як павінна праводзіцца зямляўпарадкаваньне яўрэйскай беднаты — ці шляхам арганізацыі нацыянальна замкнутых калектываў, або інтэрнацыянальных аб'яднаньняў. Асноўная ўстаноўка — інтэрнацыяналізацыя калгасаў, што, зразумела, ня выключае магчымасьці існаваньня нацыянальных калектываў. Трэба адмовіцца ад мэханічнай інтэрнацыяналізацыі, як яе праводзяць некаторыя таварышы, шляхам пераводу 50 яўрэйскіх сем'яў у беларускія арцелі, і беларускіх у яўрэйскія. Нам патрэбна такая інтэрнацыяналізацыя, якая-б на падставе працоўных прынцыпаў аблізіла-б працоўных розных нацыянальнасьцяй.

І ў пытаньні зямляўпарадкаваньня яўрэйскай беднаты трэба змагацца як са спробамі парушэньня клясавай лініі ў зямляўпарадкаваньні, так і з «архірэвалюцыйнымі» загібамі, якія прыносяць вялікую шкоду нашай рабоце па паляпшэньні жыцьця яўрэйскіх працоўных мас.

ЯКІЯ ІЛЬГОТЫ ДАЕ новы закон АБ С.-Г. ПАДАТКУ

ВЫЗВАЛЯЮЦЦА ад ПАДАТКУ

СЬВІНАГАДОЎЛЯ, ПАСЕВЫ ТРАЎ, КАРМАВЫХ КОРАНЬПЛОДАЎ, ПРЫРОСТ ПАСЕЎПЛОШЧЫ

У 12 РАЁНАХ ТАВАРНАГА МАСЛАРОБСТВА АБКЛАДАНЬНЕ ПРЫБЫТКУ З КАРОЎ ПАМЯНШАЕЦЦА Ў ДВА РАЗЫ.—ЗА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АГРА І ЗООАМІНІМУМУ ПАДАТАК ПАМЯНШАЕЦЦА НА 10 ПРОЦ.

ЗНАЧЭНЬНЕ НОВАГА ЗАКОНУ

Вялікае палітычнае значэньне новага закону аб с.-г. падатку грунтуецца на тым, што гэты закон цалкам дастасаваны да задач уздыму і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, павялічэньня яе прадукцыі і таварнасьці. Сыстэма новых ільгот робіць для калгасу і для паасобнага селяніна-бедняка ці серадняка надзвычайна выгодным кожны крок у справе паляпшэньня гаспадаркі.

Напрыклад, ільготы ў галіне жывёлагадоўлі: тут заахвочваюцца і ўздым стада, і паляпшэньня якасьці жывёлагадоўлі, і пашырэньне кармавое базы. **Сьвінагадоўля сёлета зусім вызвалена ад падаткаў. Прырост іншае жывёлы супроць мінулага году абкладаецца са скідкаю на 50 проц.**

Па 12 раёнах БССР, дзе разгортваецца таварнае масларобства, прыбытак з каро[illegible] будзе абкладацца ў два разы менш, як у 1928-29 г.

[illegible] 10 проц. скід[illegible] і з усяго падатку тым пас[illegible] калгасам, якія правядуць прасьцейшыя мерапрыемствы ў галіне жывёлагадоўлі, вызначаныя акрыканкомамі (так званы зоамінімум). Урэшце, вызвалены ад падатку засевы сеяных траў і кармавых кораньплодаў.

Другая група ільгот прызначана для паляводзтва. Па тых раёнах, дзе абкладаньне робіцца па засевах **прырост засеўнае плошчы зусім не абкладаецца. Засевы на аблогах усюды вызваляюцца ад падаткаў на два гады**, калі пры гэтым не скарацілася засеўная плошча.

Наадварот, з тых гаспадароў, якія наўмысьля скарацілі засеўную плошчу, падатак будзе налічвацца не з цяперашняе, а з леташняе плошчы засеву,

Паселішчам і калгасам, якія правядуць аграмінімум, **будзе зьнята 10 проц. з усяго падатку,** як і за зоамінімум.

Значыцца, ад самога калгасу ці вёскі залежыць **зьмяншэньне падатку адразу на 20 проц.:** для гэтага трэба правесьці зоамінімум і аграмінімум.

Засевы ільну і капаелі абкладаюцца **ў два разы менш,** як іншыя засевы.

Плошча новых агародаў абкладаецца, як палявая зямля, пасеньнікі агародных культур зусім вызваляюцца ад с.-г. падатку. І тут мы маем справу з цэлай сыстэмай ільгот за ўздым прадукцыі і таварнасьці паляводзтва.

Пералічаныя ільготы даюцца як калектыўным, так і індывідуальным бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам.

[illegible] звыш таго даецца асобная ільгота — калгасы абкладаюцца па наводле прагрэсыўных ставак падатку (як раней), а паводле прапарцыянальных ставак. Хаця-б даход калгасаў павялічыўся ў два разы і больш, стаўка сельска-гаспадарчага падатку для іх застаецца адна: **4 кап. з рубля прыбытку ў камунах і 5 кап. у іншых калгасах.**

Новы закон захоўвае ўсе ільготы беднаце. Неабкладаны ніпіму прыбыткаў у БССР сёлета павяз навышаны і захопіць большую, як летась, колькасьць бядняцкіх гаспадарак.

Іншыя маламоцныя гаспадаркі будуць вызваляцца ад падатку паводле пастаноў райпадатковых камісій.

Асобныя ільготы даюцца калгасам, у складзе якіх ёсьць беднота, якая атрымала летась ільготы: з калгасу скідаецца 75 проц. прыбытку з тэй зямлі і жывёлы, якую беднота перадала ў калгас.

Маламоцныя камуны, прыбытак якіх большы за неабкладаны мінімум вызваляюцца ад паловы падатку паводле пастаноў райпадатковых камісій.

Калгасам, беднаце і серадняцтву даюцца вялікія ільготы, а падатак кулацтва значна павялічваецца. Абкладаны даход кулакоў будзе ўлічвацца па сапраўднай прыбытковасьці без усялякіх абмежаваньняў. З гэтага прыбытку падатак будзе налічвацца па асобнай шкале ставак: ад 20 да 70 кап. з рубля прыбытку. Ніякіх ільгот ці скідак кулаком не даецца. Падатак яны павінны заплаціць да 1-га ка[illegible] стрычніка 19[illegible] г.

Разам з тым, закон катэгарычна забараняе індывідуальна абкладаць серадняцкія гаспадаркі; сьпісы кулакоў павінны дасканальна правяраца і абавязкова абгаворвацца з беднатой. Наша неадкладная задача—прасунуць гэты закон у вёску да пачатку засеўнае кампаніі, азнаёміць з новымі ільготамі ўсю працоўную масу сялянства.

М. К.

ЗАДАЧЫ АКРУГОВЫХ І РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Намесьнік наркамфіну БССР тав. **Бунін** у гутарцы з нашым супрацоўнікам паведаміў:

— Новы закон аб с.-г. падатку робіць рэзкі паварот у бок сацыялістычнага сэктару, сельскае гаспадаркі, спрыяючы і палягчаючы яго абкладаньне.

Разам з тым у законе завастраюцца клясавыя моманты шляхам узмацненьня абкладаньня кулацкіх гаспадарак, пашырэньня ільгот беднаце і дачы найшырэйшых ільгот калгасам і бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, якія павялічваюць прадукцыю і таварнасьць гаспадаркі.

Новы закон павінен адыграць вялікую ролю ў пасьпяховым правядзеньні засеўнай кампаніі.

Бліжэйшыя задачы мясцовых органаў у галіне с.-г. падатку наступныя:

Безадкладна разгарнуць самую шырокую растлумачальную работу, падкрэсьліваючы пры гэтым клясавую сутнасьць новага закону і значэньне новых ільгот у справе ўздыму калектыўнае і індывідуальнае бядняцка - серадняцкае гаспадаркі.

Да пачатку засеўнае кампаніі на ўсіх сялянскіх сходах, канфэрэнцыях, пленумах сельсаветаў, на ўсіх партыйных і камсамольскіх сходах трэба ставіць і абгаворваць пытаньні **практычнага выкарыстаньня новых ільгот па с.-г. падатку.** У гэтым сэнсе асабліва важныя ільготы за правядзеньне агра і зоамінімуму і за пашырэньне засеўных плошчаў. Трэба зьвярнуць **асаблівую ўвагу на якасьць растлумачальнай работы,** якая ў мінулым годзе моцна кульгала.

Акруговыя і раённыя арганізацыі павінны падрыхтаваць спрактыкаваных агітатараў шляхам правядзеньня кароткатэрміновых курсаў, інфармацыйных дакладаў і г. д.

Другая бліжэйшая задача па с.-г. падатку — гэта правядзеньне работы па выяўленьні і індывідуальным абкладаньні кулацкіх гаспадарак. **Гэта работа ў асноўным павінна быць скончана да пачатку агульнага падліку аб'ектаў абкладаньня.**

Вялікую ролю ў правядзеньні індывідуальнага абкладаньня адыграюць сельскія і раённыя падатковыя камісіі.

Трэба забясьпечыць, каб у склад гэтых камісій у якасьці прадстаўнікоў ад насельніцтва ўвайшлі беднякі, або маламоцныя сераднякі, рашуча не дапускаючы ў камісіі кулацкіх элемэнтаў, або падкулачнікаў, як гэта мела месца ў некаторых раёнах у мінулым годзе.

У правядзеньні індывідуальнага абкладаньня павінны прыняць самы актыўны ўдзел партыйныя і камсамольскія арганізацыі, батрацтва і беднота. **Закон рашуча патрабуе абавязковага абгаварэньня сьпісаў кулацкіх гаспадарак на батрацка - бядняцкіх сходах, бо гэта лепшая гарантыя правільнага правядзеньня клясавай лініі ў с.-г. падатку.**

Нарэшце, апошняя задача бліжэйшага пэрыяду — свячасовае выданьне пастаноў АВК па с.-г. падатку, у прыватнасьці, па агра і зоамінімуме з тым, каб свячасова скончыць падлічальную работу і перадаць акладныя лісты плацельшчыкам не пазьней 1-га жніўня, бо тэрмін выплаты падатку ў радзе месц Беларусі наступае ў канцы верасьня.

Пасьпяховае правядзеньне кампаніі па с.-г. падатку ў гэтым годзе будзе забясьпечана пры ўмове **выпраўленьня памылак мінулага году,** і ў прыватнасьці, калі ўся грамадзкасьць будзе ўцягнута ў гэту работу, калі пасапраўднаму будзе пастаўлена работа сярод беднаты. На гэта павінна быць зьвернута ўвага ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый.

М. К.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Сацыялістычныя дагавары паміж саўгасамі

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Усе саўгасы Бабруйшчыны прыступілі да заключэньня сацыялістычных дагавораў в саўгасамі Гомельшчыны на сваячасовае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі, лепшую арганізацыю працы, зьніжэньне сабекошту прадукцыі і г. д. 25-га сакавіка прадстаўнікі саўгасаў абедзьвюх округ выяжджаюць у саўгас «Пірэвіч», Бабруйскае округі, для падпісаньня ўзаемнага сацыялістычнага дагавору.

Апрача таго, бухгальтары саўгасаў Бабруйшчыны і Гомельшчыны таксама заключаюць сацыялістычны дагавор на правільнае вядзеньне статыстыкі па саўгасах і абслугоўваньне кожным бухгальтарам саўгасу аднаго калгасу.

Канфэрэнцыя жанчын-калгасьніц

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Адкрылася раённая канфэрэнцыя жанчын - калгасьніц. Дэлегацыі ад калгасаў вдаюць каштоўныя рэчы ў фонд калектывізацыі. Падана шмат заяў ад калгасьніц аб уступленьні ў камсамол і партыю.

За зрыў вапнаваньня — да адказнасьці

8 калгасаў і 4 саўгасы («Перамога», «10-ты Кастрычнік», «Чырвоны Сьцяг», «Чырвоны Кастрычнік» і інш.), Аршанскае округі, ня выканалі пляну вапнаваньня глебы. Вапны, выпрацаванай для іх Аршанскім млыном, яны да апошняга часу не забралі. За зрыў мерапрыемстваў па вапнаваньні глебы кіраўнікі гэтых саўгасаў і калгасаў прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

Пакончыць з „нэйтральнасьцю"

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Адкрылася канфэрэнцыя інжынэрна - тэхнічных працаўнікоў, на якой прысутнічае звыш 800 чал. Удзельнікі канфэрэнцыі арганізавалі дэманстрацыю. У прынятай рэзалюцыі інжынэрна - тэхнічныя працаўнікі абяцаюць прыняць самы актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве і аддаць усе свае сілы і веды на выкананьне пяцігодкі.

Канфэрэнцыя пастанавіла арганізаваць на кожным прадпрыемстве ўдарную брыгаду з тэхнічных працаўнікоў, а таксама гурткі па павышэньні кваліфікацыі рабочых і ўдарнікаў.

У часе канфэрэнцыі 20 спэцыялістых падалі калектыўную заяву аб жаданьні ўступіць у партыю.

Будаўніцтва зрываецца

ВОРША. (Наш. кар.). Саўгасы Аршаншчыны да вясны вельмі слаба падрыхтаваны. Дрэнна з насеньнем гародніны і кукурузы. Першага не хапае на 250 гэктараў і другога — на 58 гэкт. Нарады на гародніне неслабыя і кукурузу даўно ўжо ёсьць, але насеньня няма.

Белсельтрэст вылучыў сродкі на закупку 86 коняй для арганізацыі 4-х машына - конных станцый у саўгасах. Грошы ёсьць, але малочна-жывёлагадоўчы саюз да гэтага часу яшчэ ня купіў ні аднаго каня. Самі саўгасы набылі ўсяго 12 коняй і... ўсё. Для машына - конных станцый таксама не хапае 4 радавых сеялак.

На будаўніцтва павінна быць выдаткавана каля 110.000 руб., але да гэтага часу няма праектаў, каштарысаў і чарцяжоў. Грошы не адпушчаны. Будаўнічыя матар'ялы не загатоўлены.

КУЛАЦКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ ВЫКРЫТА

Калектывізацыя ў Чарэйскім раёне (Аршаншчына) праведзена на 76 проц. Збожжа абагулена на 84 проц. Горш з сельска-гаспадарчым інвэнтаром. Ня гледзячы на тое, што неўзабаве распачынаецца веснавая сяўба, праўленьні калгасаў марудзяць з рамонтам абагуленага с.-г. інвэнтару.

Мясцовым партыйным і савецкім арганізацыям трэба ўзмацніць барацьбу з кулацтвам, якое распускае чуткі, што нібы ўсім уступіўшым у калгасы будуць прыкладаць кляймо. З прычыны такое злоснае хлусьні, былі паасобныя выхады беднякоў і сераднякоў з калгасаў. Толькі пасьля таго, калі была праведзена растлумачальная работа, калі былі выкрыты ўсе махінацыі кулацтва, сяляне, якія выйшлі з калгасаў, пачалі варочацца назад.

Д. Д.

Перавыбары заўкомаў мэталістых

Пытаньні вытворчасьці на заднім пляне

Аб пасьпяховасьці перавыбараў будзем судзіць паводле выкананьня прамфінпляну

Неадкладна пераключыць падрыхтоўку на рэйкі сапраўднай масавасьці

На „Эльводзе"— прарыў

На паасобных прадпрыемствах саюзу мэталістых ужо канчаецца падрыхтоўка да перавыбараў заўкомаў. Брыгады добраахвотнікаў падлічваюць вынікі праверкі работы сваіх заўкомаў. Але гэта яшчэ ня сьведчыць аб тым, што падрыхтоўка ўсюды прайшла здавальняюча. Найбольш яскравы адмоўны прыклад дае падрыхтоўка на менскім «ЭЛЬВОДЗЕ». Галоўнае месца ў падрыхтоўцы заняла «мітынгоўшчына». Заўком ухіліўся ад глыбокай прапрацоўкі задач, якія стаяць зараз перад кожнай нізавой праф'ячэйкай, не растлумачыў рабочым пра новыя формы і мэтады працы прафарганізацый, НЕ ЎВЯЗАЎ ГЭТЫХ ПЫТАНЬНЯЎ З ВЫКАНАНЬНЕМ ПРАМФІНПЛЯНУ І ЗНІШЧЭНЬНЕМ НЕПАЛАДАК І НЕДАХОПАЎ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ. Таму падрыхтоўка, замест таго, КАБ ПАЛАЖЫЦЬ КАНЕЦ РАСХЛЯБАНАСЬЦІ І НЯДБАЙНЫМ АДНОСІНАМ АДСТАЛЫХ РАБОЧЫХ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ, ня ўнесла ніякіх паляпшэньняў у рабоце прадпрыемства. Наадварот, ВЫПАДКІ ПАРУШЭНЬНЯ ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА З КОЖНЫМ ДНЁМ: калі ў лютым было 5 такіх выпадкаў, дык за 20 дзён сакавіка ўжо налічваецца 10 выпадкаў. Звычайнае зьявішча, калі за 5-10 мінут да гудка каля буфэту ўжо стараецца чарга. Гэтыя факты гавораць аб тым, што НІЯКАГА ПЕРАЛОМУ Ў РАБОЦЕ ПРАДПРЫЕМСТВА ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАВЫБАРАЎ ЗАЎКОМУ НЯ ПРЫНЕСЛА.

Падрыхтоўка да перавыбараў нават не ахапіла ўсіх РАБОЧЫХ «ЭЛЬВОДУ». Сярод рабочых, якія працуюць у начной зьмене, а таксама, якія працуюць у горадзе, ніякай растлумачальнай работы аб перавыбарах ня было.

Для праверкі работы заўкому запісалася 40 добраахвотнікаў, але праверку праводзілі ТОЛЬКІ 15-20 ЧАЛАВЕК і то яны працавалі з халадком.

Многія рабочыя на пытаньне, як прайшлі сходы, адказваюць — «ВЕЛЬМІ СУХА». На пытаньне — «Чаму-ж ня пішаце аб гэтым у насьценгазэту?» — быў адказ — «Наша насьценгазэта не зьяўляецца аўтарытэтам ДЛЯ ЗАЎКОМУ. Мы ўжо пісалі, пісалі, адказаў ніколі не атрымлівалі, а таму і кінулі пісаць».

Пакуль ня позна, трэба заўкому «Эльводу» і БЕЛКАМІТЭТУ САЮЗУ МЭТАЛІСТЫХ зрабіць з гэтых фактаў належныя вывады.

А. МАНЬКОЎ.

РАБКОРЫ! ПРАФАКТЫВІСТЫЯ!

Пішэце аб ходзе падрыхтоўкі да перавыбараў і перавыбарах заўкомаў. Правярайце штодзённа выкананьне лютаўскай пастановы ЦК УсеКП(б).

АБ АСНОЎНЫМ ЗАБЫЛІСЯ

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

Падрыхтоўка да перавыбараў заўкому на заводзе «Адраджэньне» за апошні час нескалькі палепшылася. Праведзена нескалькі сходаў на цэхах, агульна-камсамольскі сход, на якіх было растлумачана рабочым значэньне перавыбараў. Зараз увесь завод ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам на 100-проц. яўку на выбары і лепшы ўдзел у аглядзе работы заўкому. Камсамол абвясьціў сябе ўдарным на правядзеньні падрыхтоўча - перавыбарчай кампаніі.

Але асноўнае на заводзе яшчэ ня зроблена. Цэнтральныя пытаньні — **барацьба за прамфінплян, перабудова прафработы, праверка кіраўніцтва ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам, зжыцьцяўленьне дарэктывы аб адзінаначальні** — не знаходзяць у падрыхтоўцы поўнага адлюстраваньня. На сёньнішні дзень **звыш 30 проц. рабочых ня прымаюць ніякага ўдзелу ў сацспаборніцтве.** Больш таго: **з 36 членаў партыі толькі 13 чалавек ахоплена сацспаборніцтвам,** ня гледзячы на дзьве пастановы бюро аб 100-проц. удзеле партыйцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве.

Яшчэ горш ідзе падрыхтоўка да перавыбараў на «Водосвете». Там, як відаць, не ўсьвядомлена палітычнае значэньне перавыбараў. Камсамольская ячэйка нядбайна адносілася да перавыбараў. Да 21-га сакавіка ні адзін камсамолец ня прымаў удзелу ў падрыхтоўцы. **Сакратар камсамольскай ячэйкі адмовіўся склікаць сход камсамольцаў,** лічачы, што ня трэба абгаворваць гэта пытаньне «па"5 разоў». Таму з 25 камсамольцаў запісалася добраахвотнікамі для праверкі работы заўкому **толькі тры,** але і тыя да 21-га сакавіка да работы не прыступілі.

Не пачалі працы па аглядзе работы заўкому і **брыгады добраахвотнікаў.** Шмат рабочых яшчэ ня ведае, калі будуць адбывацца перавыбары і мала знаёмы з іх значэньнем. Цэхавых сходаў на «Водосвете» яшчэ ня было. **Партыйная ячэйка гэтай работай ня кіруе. Насьценная газэта не зьмясьціла ні аднаго артыкулу.**

Нядбайныя адносіны наглядаюцца таксама з боку прадстаўніка Акрпрафбюро, які да гэтага часу ні разу на прышоў на прадпрыемства.

А. СЯНЬКЕВІЧ.

ТРЫВОЖНЫ СЫГНАЛ З ВІЦЕБСКУ

Дрэнная падрыхтоўка — дрэнныя вынікі

Да 10-га сакавіка на прадпрыемствах мэталістых Віцебску павінны былі адбыцца цэхавыя сходы на трох пытаньнях: па рэарганізацыі саюзнага апарату, аб новай сыстэме работы прафсаюзаў і пра значэньне перавыбараў заўкомаў. На гэтых-жа сходах павінны былі быць выбраны брыгады для праверкі работы заўкомаў. Між тым, **толькі ў апошнія дні на некаторых прадпрыемствах адбыліся цэхавыя сходы.** Такім чынам, тэрміны падрыхтоўкі сарваны.

Зараз віцебскія прафарганізацыі пачалі сьпяшацца. Без належнай падрыхтоўкі склікаюцца цэхавыя сходы. Таму былі выпадкі **зрыву цэхавых сходаў з прычыны няяўкі рабочых.** А на акулярнай фабрыцы сход быў сарваны таму, што ня прышоў дакладчык, **выпучаны акрпрафбюро.** Балай, як правіла, таварышы, якія выпучаны акрпрафбюро для дапамогі перавыбарчай кампаніі, **не зьяўляюцца на прадпрыемствы.**

Наведваньне сходаў наогул нездавальняючае. Толькі на сходзе рабочых мэханічнага цэху заводу **«Чырвоны Мэталіст»** прысутнічала 99 проц рабочых. Затое на сходзе рабочых **ліцейнага цэху** прысутнічала толькі 67 проц. рабочых, а на сходзе вячэрняй зьмены **толькі — 46 проц.**

Адстае і **акулярная фабрыка.** Толькі апошнімі днямі на фабрыцы разгарнулася сацспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку паміж цэхамі. На сходзе ў шліфавальным цэху прысутнічала 97 проц. рабочых.

На заводзе **«Чырвоны Молат»** паведваньне сходаў не перавышае **50 проц.**

Б. Д.

Прафорганы на цікавяцца

Цэнтральны Камітэт партыі ў свае лютаўскай пастанове падкрэсьліў, што **«перавыбары ФЗМК па саюзе мэталістых павінны быць праведзены, як баявая палітычная кампанія», «павінны стаць прыкладам для іншых саюзаў».**

Гэта выразная дырэктыва яшчэ да гэтага часу многімі партыйнымі і прафесыянальнымі арганізацыямі Беларусі ня выконваецца.

Так, напрыклад, **Аршанскае акрпрафбюро** выдучыла 4-га сакавіка ў дапамогу саюзу мэталістых 8 чалавек, а фактычна прыступілі да работы тры чалавекі і тыя толькі 11 сакавіка. Прафарганізацыі Магілева да 19-га сакавіка не зварачалі на перавыбары ніякае ўвагі. Газэта «Камунар Магілеўшчыны» абыходзіла пытаньне моўчкі. У тым-жа Магілеве на заводзе «Адраджэньне» пытаньне аб перавыбарах заўкому раней абгаворвалася на сходзе рабочых, камсамольцаў і толькі потым на сходзе парт'ячэйкі.

Як агульнае зьявішча, трэба адзначыць, што заўкомы вельмі мала ўвагі зварачаюць на культурна - бытавую работу.

Паперніки пераабіраюць свае фабкомы

Новыя мэтады узварушылі рабочыя масы

Рабочыя брыгады фабрыкі „Чырвоная Зорка" выкрылі абураючую безгаспадарчасьць, зацiск самакрытыкі, буйныя недахопы ў сацспаборніцтве і ўдарным руху і на фоне ўсяго гэтага— БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ ФАБКОМУ

На паперовай фабрыцы **«Чырвоная Зорка»** (Чашнікі, Віцебскае округі) **скончыліся перавыбары фабкому.** На працягу цэлага месяца рабочыя разьбіралі работу фабкому «па костачках». **123 добраахвотнікі, арганізаваныя ў 20 брыгад,** адначасова абсьледвалі **20 розных галін работы фабкому.** Амаль $^1/_3$ рабочых фабрыкі прыняла актыўны ўдзел у аглядзе работы фабкому. Такі масавы кантроль, акрамя таго, што ўцягнуў шмат рабочых, акрамя таго, што зацікавіў іх пытаньнямі прафработы і вытворчасьці, **прынёс яшчэ шмат канкрэтных вынікаў,** якія павінны прывесьці да паляпшэньня работы фабрыкі **і выкананьня прамфінпляну.** Праўда, гэта будзе толькі ў тым выпадку, калі **новы фабком выканае наказы рабочых і будзе ўважліва сачыць за тым, каб прапановы рабочых па паляпшэньні вытворчасьці былі праведзены ў жыцьцё.**

Што-ж выявіла праверка работы фабкому? Папершае, што на фабрыцы пануе абураючая **безгаспадарчасьць,** а падругое, што **фабком больш пыпаў вачыма, чым дапамагаў выкананьню прамфінпляну.**

Дырэктар фабрыкі т. **Бардоўскі** нават ня ведаў, колькі рабочых працуе на фабрыцы. Больш таго, ня ведаў аб гэтым і сам табельшчык.

З наборам рабочай сілы справа стаіць дрэнна. На фабрыку прымаюць усіх, хто толькі ня просіць работы. Таму фабрыка падобна да прахаднога двара. На працягу года праз фабрыку прайшло **600 рабочых.** Гэта значыць, што 600 рабочых на працягу года было прынята на работу і, прапрацаваўшы некаторы час, пакідалі работу. Такая цякучасьць рабочай сілы не дае магчымасьці надняць кваліфікацыю рабочых, у выніку чаго вельмі частыя ўсякія паломкі машын і аварыі.

Кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарным рухам пастаўлена не здавальняюча. Фабрыка ўся абвешчана «ўдарнай», але сапраўднымі ўдарнікамі зьяўляюцца ня **больш 50 проц. рабочых.** Некаторыя цэхі ня прымаюць нават удзелу ў сацспаборніцтве.

Фабком не заўважыў такога буйнога недагляду, **як адсутнасьць пляну працы напізацыі.** Толькі нядаўна камісія «Аргбуму», якая наведала фабрыку, вызначыла некалькі рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. У той-жа час адміністрацыя выканала ўсяго толькі **38 проц. прапаноў рабочых аб рацыяналізацыі і паляпшэньні вытворчасьці.** Фабком і гэтыя злачынныя адносіны да рабочых прапаноў **самым ганебным чынам праспаў.**

Такія адносіны да вытворчасьці як з боку адміністрацыі, так і фабкому прывялі да сыстэматычнага **недавыкананьня прамфінпляну.** У кастрычніку вытворчая праграма выканана на 88 проц., у лістападзе — на 95 проц., у сьнежні—на 104,6 проц., у студзені—на 92 проц., а ў лютым—на 69 проц. Праўда, у лютым здарылася аварыя машыны, работа была на некаторы час спынена, але прарыў быў-бы значна меншы, **калі-б арганізацыя працы на фабрыцы была лепшая.** Гэта відаць таксама з таго, што заданьне аб зьніжэньні сабекошту **ня выконваецца:** замест 12 проц. сабекошт за 5 месяцаў зьніжаны ўсяго на 5½ проц.

У часе праверкі работы фабкому таксама выяўлены **зацiск самакрытыкі.** Старшы цэху Вайцахоўскі, калі на фабрыцы праходзіла чыстка, сказаў работніцам: «Калі вы будзеце мяне чысьціць, я вас вычышчу»! І сапраўды, калі некаторыя работніцы выступілі супроць Вайцахоўскага, ён іх перакінуў на іншую работу. Таксама выяўлен выпадак прасьледваньня рабкора за заметкі. **І ў гэтых справах фабком адыгрываў пасыўную ролю.**

Наогул, праверка работы фабкому выявіла шмат недахопаў і ў рабоце самой фабрыкі. Трэба яшчэ адзначыць такі абураючы факт. Ад

Агляд грамадзкага харчаваньня

Да якіх прадпрыемстваў прымацоўваюцца сталоўкі і буфэты МЦРК

Саюз харчавікоў. 1) Сталоўка № 10 (вул. Лекерта пры зав. «Энэргія»)—«Чырвоная Зара»; 2) сталоўка № 11 (Савецкая 37)—хлебазавод; 3) сталоўка № 3 (Савецкая 86/28)—дражджавы завод «Пралетары»; 4) сталоўка ЖАКТу № 16 (Інтэрнацыянальная № 8)—бровар «Беларусь»; 5) дзіцячы сад ЖАКТу № 18 (Інтэрнацыянальная, № 8); 6) дзіцячы сад ЖАКТу № 22 (Інтэрнацыянальная, № 8); 7) дзіцячы сад ЖАКТу № 1 (Інтэрнацыянальная, № 8)—фабрыка цукерак «Прагрэс»; 8) чайная Чырвонага Крыжу (Сьвярдлоўская № 19)—ільнятавы завод; 9) сталоўка і буфэт АБВШ (Камунальная, 7)—каўбасная фабрыка Белмясгандлю; 10) сталоўка і буфэт 2-га артпалка (Козырава)—бойня.

Саюз друкароў. 11) Сталоўка № 1 (Інтэрнацыянальная, 8)—1-я дзярждрукарня; 12 сталоўка № 4 (Вул. Лекерта пры гарбарні «Бальшавік»)—друкарня «Зьвязды»; 13) сталоўка і буфэт 38 палка—шпалерная фабрыка; 14) сталоўка і буфэт 40-га кав. палка—друкарня БАН; 15) буфэт аддзел. хлебазаводу; 16) буфэт пабудовы Дзяржбанку; 17) буфэт ЦПІ; 18) буфэт ЦК КП(б)Б (вул. К. Маркса)—працаздатнасьці друкароў.

Саюз мэталістых. 19) Сталоўка № 9 (Чырвонаармейская пры Доме Селяніна)—завод «Камунар»; 20) сталоўка № 6 (Ленінская, № 1)—зав «Энэргія»; 21) сталоўка № 5 (пры заводзе «Дрэваапрацоўшчык»)—Эльвод; 22) буфэт 33 сям. школы (Міхайлаўская, № 4); 23) буфэт 6-га стралковага палка (вул. Энгельса); 24) буфэт 17-й школы (вул. Энгельса); 25) буфэт 39 кав. палка (Першамайская); 26) буфэт пабудовы 70-кватэрн. дому (рог Унівэрсыт. і Камсамольская)—белпалата мер і вагі.

Саюз гарбароў. 27) Сталоўка № 8 ЦРК (Савецкая, 69)—гарбарня «Бальшавік»; 28) буфэт «Эльводу» (Савецкая) —фабрыка абутку; 29) буфэт торфараспрац. (Савецкая); 30) буфэт пабудовы [illegible] (Савецкая); 31) буфэт сельскагаспадарчай выстаўкі (Савецкая)—фабрыка абутку; 32) буфэт 20 школы ФЗН (вул. Лекерта № 5); 33) буфэт бойні (Сьвярдлоўская вул.); 34) буфэт зав. «Чырвоная Зара» (вул. Лекерта)—[illegible] фабрыка; 35 буфэт [illegible] гарбарні «Бальшавік» (вул. Лекерта); 36 буфэт пабудовы ф-кі цукерак—шчацінная фабрыка; (вул. Лекерта); 37) буфэт ЦСУ; 38) буфэт штабу корпуса; 39) буфэт Наркамправы; 40) буфэт Дзяржвыдавецтва; 41) буфэт Дзяржбанку—1-ы працкалектыў абуткікаў; 42) буфэт 1-шага палка АДПУ; 43) буфэт 1 дзярждукарні; 44) буфэт Белдзяржгандлю; 45 буфэт Наркамюсту і буфэт МЦРК—Шавецкія майстэрні гандальбуду.

Саюз будаўнікоў. 47) сталоўка камбузу (К. Маркса № 33)—унівэрсытэцкі гарадок; 48) сталоўка палітэхнікуму (К. Маркса № 30)—кафэльны завод; 49) сталоўка і буфэт 37-га палка—Вадаканалбуд; 50) буфэты Менкомзу (пры фабрыцы «Кастрычнік»); 51) фармазаводу; 52) ф-кі «Адраджэньне»; 53) буфэт шчотач. ф-кі—Белдартрансу.

Саюз дрэваапрацоўшчыкаў. 54) сталоўка № 2 ЦРК (рог Савецкай і Энгельса)—зав. «Дрэваапрацоўшчык».

Саюз швэйнікаў. 55) сталоўка № 7 (пры Унівэрсытэц. гарадку)—«Кастрычнік швэйная фабрыка; 56) сталоўка прафшколы (Першамайская, 9)—футравая фабрыка.

Саюз чыгуначнікаў. 57) Буфэт і сталоўка ТПО (пасажырская станцыя) — МК № 1 тав. стан.; 58) сталоўка пры чыгунач. майстэр. (таварная станцыя)—МК № 2 пасажырск. станц.; 59) сталоўка № 1 ТПО (супроць таварн. стан.)—МК № 3 пасаж. станц.; 60) сталоўка беспрацоўных (Маскоўск. вул.) МК № 4 таварн. станцыя.

Саюз камунальнікаў. 61). Буфэт арцель панчошнікаў; 62) буфэт вайсковага шпіталю; 63) буфэт ф-ка «Адраджэньне»; 64) буфэт пагельні № 8; 65) буфэт пагельні № 2—пажарная каманда.

Саюз хэмікаў. 66) Сталоўка БДУ (в. Энгельса) — гута «Пралетары»; 67) буфэт Наркамзему (Савецкая, 71); 68) буфэт Наркамфіну (Савецкая 45); 69) буфэт АДПУ (Савецкая); 70) буфэт 1-е гасьцініцы (Камсамольская, 15) — цагельня № 1; 71) буфэт шчацінный ф-кі; 72) буфэт абутковай ф-кі; 73) буфэт гуты «Пралетары»; 74) буфэт цагельні № 4—фармазавод.

Саюз тэкстыльшчыкаў. 75) Культурная чайная (Савецкая вул.)—«Чырвоны Тэкстыльшчык»; 76) дзіцячы сад ЖАКТу № 10; — 77) дзіч. сад ЖАКТу № 3—п.-к. вяровачнікаў; 78) дзіч. сад ім. 1-га мая; 79) дзіч. сад пас. «Камінтэрн»; 80) дзіч. сад ЖАКТу № 9 п.-к. лямпавікоў.

Саюз транспартнікаў. 81) Буфэт 8-й сямігодкі; 82) буфэт лямпавай фабрыкі; 83) буфэт галінтарэйнай фабрыкі; 84) буфэт зав. «Варшавянка» — рабачком грузчыкаў; 85) буфэт 11 сямігодкі; 86) буфэт 4-й сямігодкі; 87) буфэт пэдтэхнікуму — 2-гі рабачком; 88) буфэт эскадр. сувязі—транспарт. станц.; 89) буфэт базы Белдзяржбуду — Менск; 90) буфэт футравай фабрыкі — грузчыкі ст. Менск пасаж.

Конкурс „Зьвязды" на карэспандэнцыі аб лепшай і горшай сталоўцы

Умовы конкурсу

Для правядзеньня абвешчанага «Зьвяздою» конкурсу па карэспандэнцыі аб лепшай і горшай сталоўцы, пры цэнтральнай аглядавай камісіі грамадзкага харчаваньня вызначана журы, якое складаецца з т. т. Сяргеева (рэд. «Зьвязда»), Адлерштэйна (ЦКК РСІ), Мазалева (Белкаапсаюз), Васільева (ЦСПСБ) і Злотнікава (ЦП саюзу нарчарч).

Да карэспандэнцый на конкурс прад'яўляюцца наступныя запатрабаваньні: кароткасьць, выразнасьць, ілюстрацыя фактамі. Карэспандэнцыя павінна паказваць, ці адпавядае даная сталовая ў сучаснай сыстэме грамадзкага харчаваньня тым патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да грамадзкага харчаваньня ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, ці адпавядае сыстэма яе абслугоўваньня павялічэньню рэальнай зарплаты рабочых, укараненьню грамадзкага харчаваньня ў рабочы быт, ці наадварот. У карэспандэнцыі павінна быць выразна выказана роля і кіраўніцтва вышэйшай каапэрацыйнай арганізацыі.

У карэспандэнцыях аб горшай [illegible] сталоўцы павінны быць асьветлены [illegible] момантаў: [illegible] бюракратызму адміністрацыі, засьмечанасьці апарату чужым і непрыстасаваным элементам, дарагоўля і кепская якасьць прадукцыі, галавацяпскі ўнутраны распарадак, у выніку якога адрываецца і губіцца рабочы час, ствараюцца вялікія чэргі, непрыстасаванасьць сталовае да абслугоўваньня прадпрыемства, і наогул спажыўца, антысанітарны стан, асноўныя прычыны незадавальненьня рабочага спажыўца і інш.

Аб лепшай сталоўцы — гібкасьць і прыстасаванасьць сталоўкі да хуткага і бесьперабойнага абслугоўваньня спажыўца, увязаная з вытворчым працэсам прадпрыемстваў. Процант рабочых і служачых прадпрыемства ці ўстановы, ахопленых грамадзкім харчаваньнем і як яно ўкараняецца ў быт, асабліва ў шматсямейных. Максымальнае зьніжэньне сабекошту і добрая якасьць прадукцыі, здаровы прытулак, добра пастаўлена гігіенічна-санітарная справа, чулы, працаздольны апарат і г. д.

Для прэміяваньня карэспандэнцый устанаўляецца 6 прэмій, з іх 3 прэміі за карэспандэнцыі аб лепшай сталоўцы і 3—аб горшай.

Разьмеры прэмій: 2 першыя прэміі (за горшую і за лепшую) — па 300 руб., 2 другія прэміі — па 200 руб. і 2 трэція — па 100 руб.

Выплата прэмій праводзіцца цэнтральнай аглядавай камісіяй пры «Зьвязьдзе», паводле прысуду журы.

Усе карэспандэнцыі да конкурсу павінны быць за поўным і выразным подпісам, з азначэньнем месца службы, займаемай пасады і дакладнага адрасу. Прысылаюцца яны ў запячатаных канвэртах па адрасе: Менск, рэдакцыя «Зьвязды» «на конкурс па грамадзкім харчаваньні».

З лістоў рабселькораў

СКАРЫСТАЦЬ ГНОЙ ДЛЯ ПАЛЁЎ

За зіму ў гарадох, асабліва на рынках, пазьбіралася шмат гною. З надыходам вясны яго трэба выкарыстаць на нашых палёх. Належныя арганізацыі павінны ўлічыць гэтую акалічнасьць і даць адпаведны загад на месцы аб выкарыстаньні гэтага гною саўгасамі і калгасамі.

Ён напэўна павысіць урадлівасьць нашых палёў.

Мілкоўская.

РАМОНТ ПАД ПАГРОЗАЙ

Рамонт гуты «Камінтэрн» (Вабруйшчына) знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Ня гледзячы на тое, што да рамонту засталося ня больш трох з паловаю месяцаў, загатоўка будаўнічага матар'ялу вядзецца слаба. Ганчарнае аддзяленьне заводу ня мае матар'ялу для выпрацоўкі патрэбных часьцей для рамонту. Паміж Белшклатрэстам і кіраўніцтвам заводу вядзецца непатрэбная пісаніна, а канкрэтнай работы няма.

Бяльмо.

СКОНЧЫЦЬ З НЕПАЛАДКАМІ

У каўбаснай Мазырскай ЦРК працуе 16 рабочых, але калектыўны дагавор на іх не заключаны. Рабочыя ня маюць норм выпрацоўкі. Працдысцыпліна адсутнічае, якасьць прадукцыі каўбаснай дрэнная: у каўбасы часта трапляюць кавалкі вяровак, бляхі, шкла і інш. рэчы. Ударная брыгада з рабочых ня створана. Ня гледзячы на тое, што ў гэтай каўбаснай працуе і сакратар парт'ячэйкі ЦРК т. Трэйстар, апошні ніякіх канкрэтных мер для зьнішчэньня ўсіх гэтых ненармальнасьцей ня прымае.

КЕДАПУШЧАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ВЫЛУЧЭНЦАЎ

У апарат «Днепрасаюзу» (Верша) паслана на працу 8 рабочых-вылучэнцаў, але адносіны да іх з боку работнікаў апарату вельмі дрэнныя. Загадчык апэрацыйнага аддзелу Хазан замест падтрыманьня, і дапамогі груба вылаяў рабочага фабрыкі «Дняпроўская Мануфактура» т. Трутня, які быў вылучаны кіраўніком гандлёвае часткі апэрацыйнага аддзелу і дапусьціў у рабоце памылку.

ЗЬВЯЗДА.

МЕНСК

Арганізацыя сельска-гаспадарчых трэстаў

Савет Народных Камісараў БССР прызнаў неабходным правесьці ў гэтым годзе спэцыялізацыю саўгасаў, каб ператварыць іх у буйныя сельска - гаспадарчыя фабрыкі — малочна - жывёлагадоўчую, сьвінагадоўчую, ільна-канаплянную, бульбяна - прамысловую і г. д. Паколькі сучасная структура Белсельтрэсту ня можа спрыяць спэцыялізацыі саўгасаў, СНК пастанавіў на працягу гэтага году рэарганізаваць Белсельтрэст шляхам арганізацыі спэцыяльных трэстаў, у першую чаргу, малочна-жывёлагадоўчага і сьвінагадоўчага.

Усебеларуская канфэрэнцыя дашкольных работнікаў

Заўтра ў доме працасьветы адкрываецца ўсебеларуская канфэрэнцыя дашкольных работнікаў. На канфэрэнцыі прыяжджае прадстаўнік НКА РСФСР т. Сураўцова.

ЗА ДЗЕНЬ

26-га сакавіка склікаецца **гарадзкая канфэрэнцыя таварыства «Прэч няпісьменнасьць»**, на якой будзе абмяркоўвацца пытаньне аб рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці ў Менскай акрузе і аб задачах па далейшай ліквідацыі няпісьменнасьці.

— Сёньня ў ЦСПСБ адбылася нарада прадстаўнікоў ЦП саюзаў па пытаньні аб **грамадзкім харчаваньні** і конкурсе на лепшую і горшую заметку аб сталоўках, абвешчаным газэтай «Зьвязда».

Назначэньні

СНК БССР назначыў тав. РЫЎЛІНА намесьнікам народнага камісара асьветы. Да апошняга часу тав. Рыўлін займаў пасаду намесьніка рэктара БДУ.

Тав. АНІСІМАЎ назначаны намесьнікам начальніка галоўнай управы шосавых дарог і аўтамабільнага транспарту. Гэтыя назначэньні перададны на зацьвярджэньне ЦВК БССР.

Водгукі на заметкі

БЫЛАЯ АБШАРНІЦА ЗЬНЯТА З РАБОТЫ

Селькор нам паведамляў, што ў **Даманавіцкай школе**, Лупалаўскага раёну (Магілеўшчына), на пасадзе настаўніцы працуе былая абшарніца **Тамашэвіч**. Паказаныя ў заметцы факты цалкам пацьвердзіліся. Былая абшарніца Тамашэвіч **з работы зьнята і зараз знаходзіцца пад вартай.**

ЗА СУВЯЗЬ З ГАНДЛЯРАМІ ДА АДКАЗНАСЬЦІ

У «Зьвязьдзе» ў № 287 у артыкуле «На праверачных сходах» пісалася, што загадчык Продасілікату **Ваксман** трымаў сувязь з варожымі спэкулянцкімі элементамі, якія пры дапамозе Ваксмана пралезьлі на работу ва ўстановы. Ваксман адпускаў прыватнікам - гандляром розныя тавары ў крэдыт і інш.

Менакрпракуратура паведаміла, што паказаныя ў артыкуле факты ў асноўным пацьвердзіліся. **Ваксман прыцягваецца да судовай адказнасьці.**

ПРЫЦЯГВАЮЦЦА ДА АДКАЗНАСЬЦІ ЗА БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ

Рабочая брыгада, якая абсьледвала склады каапэрацыі Коханаўскага раёну, выявіла, што сельска - гаспадарчыя машыны ляжаць пад адкрытым небам, насеньне, якое знаходзіцца ў складзе, засыпана сьнегам, мяшкі з угнаеньнем мокрыя. Аб гэтым пісала «Зьвязда» ў № 37.

Аршанскі акрпаляводсаюз паведаміў, што справа аб безгаспадарчасьці перадана акрпракуратуры для прыцягненьня да адказнасьці былога старшыню Коханаўскага крэдытнага т-ва **Жыткоўскага**, члена праўленьня райпаляводсаюзу **Жураўскага** і загадчыка складам **Дускіна.**

ПАМЫЛКІ ВЫПРАЎЛЕНЫ

Селькор **Зоркі** пісаў, што Старасельская парт'ячэйка (Аршаншчына) слаба дапамагае калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Копыскі райком КП(б)Б паведаміў, што парт'ячэйка сапраўды мела пэлы рад памылак, якія ў далейшай рабоце зьнішчыла. У выніку чаго ў мястэчку Старасельле арганізаваны калгас, у які ўвайшло 140 гаспадарак. Усе калгасы Старасельскага сельсавету яднаюцца ў адну буйную гаспадарку.

Пасылка перароскаў з дзіцячых установаў на прадпрыемствы

СНК БССР прапанаваў Белсельтрэсту прыняць звыш броні ў падпарадкаваныя яму прадпрыемствы 64 перароскаў з дзіцячых дамоў; Белкаапсаюз павінен прыняць 100 чал., Белсампрамсаюз — 100, Белкалгасцэнтр — 100, ВСНГБ — 150 і Наркампрацы 100 чал.

Беллаяводсаюзу і малочна - жывёлагадоўчаму саюзу прапанавана прыняць на работу ўсіх падпрыемстваў - батракоў, якія зараз знаходзяцца ў кулацкіх гаспадарках і будуць накіроўвацца НКА на работу.

Як ідзе пабудова дому ўраду

Наш супрацоўнік меў гутарку з галоўным інжынэрам пабудовы дому ўраду т. **Шарковым**, які паведаміў аб ходзе падрыхтоўкі да будаўніцтва.

Падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва дому ўраду вядуцца ўзмоцненым тэмпам. На сёньнешні дзень з патрэбных 12 млн. штук цэглы ужо падвезены 4 млн. Акрамя гэтага ідзе падрыхтоўка іншых будаўнічых матар'ялаў. Работы вядуцца пры ўдзеле 3-х нямецкіх спэцыялістых, якія запрошаны Белдзяржбудам. Спэцыялістыя працуюць у якасьці начальнікаў работ па распрацоўцы канструкцыйных чарцяжоў і па рацыяналізацыі работ.

Дом ураду будуецца паводле праекту архітэктара Лангбарда, які ў пачатку сакавіка прыслаў поўнасьцю закончаныя праекты. У першай палове красавіка праекты будуць паданы ў СНК.

Усяго будынак будзе займаць плошчу ў 7.000 кв. мэтраў. У будынку будзе разьмеркавана каля 22 наркаматаў і распубліканскіх установаў. Будынак адрозьніваецца сваёй прастатой і станцыяльнымі асобных частак. Зараз распрацоўваецца пытаньне тэлефанізацыі і мэханізацыі сувязі паміж паасобнымі наркаматамі. Мяркуецца арганізаваць навертаную, электрычную пошту і інш. віды сувязі, каб поўнасьцю абяднаць усе наркаматы.

Вылучана спэцыяльная камісія, якая займаецца пытаньнем мэбляваньня будынку, забесьпячэньнем яго неабходнымі навейшымі стандартызаванымі лічыльнымі, пішучымі і інш. машынамі.

Пры доме ўраду будзе пабудаваны спэцыяльны гараж, дом для служачых, кацельня і інш. дапаможныя будынкі.

Будаўніцтва адчувае недахват некаторых будаўнічых матар'ялаў, асабліва жалеза і труб.

З надыходам цёплага надвор'я, на будаўніцтве кожны год будзе працаваць ня менш 1.000 рабочых.

Паводле папярэдніх меркаваньняў, будаўніцтва дому ўраду абыдзецца ня менш, чым у 6 млн. р. і канчаткова будзе скончана ў 1932 годзе.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

24 сакавіка, а 20 гадз., у клюбе Навуковых Працаўнікоў, адбудзецца адкрытае пасяджэньне таварыства ваяўнічых матар'ялістых - дыялектыкаў. Парадак дня: 1) Даклад праф. БУРСТЫНА—Заканамернасьць з пункту погляду сучаснай фізыкі (працяг) і 2) Зацьвярджэньне статуту.

АД ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б

Фрунзаўскі РК КП(б)Б прапануе ячэйкам: зав. «Камунар», «Беларусь», «Дрэваапрацоўшчык», хлебазаводу і яго аддз., ф-к «Акцябр», галянтарэйнай, «Чырвоны Тэкстыльшчык», скарняжнай, шпалернай і «Прагрэс», яч. друкарні БДВ, Белдзяржбуду, Гандальбуду, Эльводу, каап. прадпр. харчавікоў, РК ЛКСМБ, аўтакіраўніцтва і п.-к. паліграф—выканаць абанязкова даную разьвёрстку пры адносьніку ад 13 сакавіка аб адборы партыйцаў на курсы прапагандыстых, і ўсіх таварышоў, якія адабраны паводле разьвёрсткі, 25 сакавіка ў 19 гадз. накіраваць у адборачную камісію, якая будзе працаваць пры АПА РК.

Дом Працасьветы. 27 сакавіка для членаў саюзу Працасьветы Белдзяржтэатрам будзе пастаўлены спэктакль «Разлом». Білеты ў Доме Працасьветы ад 12—2 гадз. дня і ад 6—10 гадз. увеч. кожны дзень.

СЁНЬНЯ

Мен. АЗЕТ (Пляц Волі, 23). У 19 гадз. адбудзецца пасяджэньне адборачнай камісіі.

Пэдгабінэт. У 20 гадз. гурток па маляваньні. Увязка маляваньня з праграмнымі тэмамі ў першым канцэнтры.

У 20 гадз. адбудзецца чарговы сход пэдалёгічнай сэкцыі дашкольніц.

Дом Асьветы. Даклад пам. заг. АПА ЦК КП(б)Б т. **Будзінскага** на тэму: «Правы ўхіл у культурным будаўніцтве». Пач. у 20 гадз.

Пяцідзённы рабочы унівэрсытэт (былы нядзельны). Заняткі у-ту адбудуцца ў 41 аўд. старога будынку БДУ. Пач. у 18 з пал. гадз.

ЗАЎТРА

Дом Камасьветы. Ад 19 да 21 гадз. (пакой № 21) індывідуальная кансультацыя т. **Клыса** на тэму: «Як зьвязацца з рабочымі капіталістычных краін праз эспаранта і як навучыцца адзінай міжнароднай мове эспэранта».

Рэспубл. Бюро АРУ. У 18 з пал. гадз. пасяджэньне прэзыдыуму бюро АРУ, сумесна з актывам па пытаньні аб разглядзе і зацьвярджэньні плянаў працы сэктараў.

БДУ. Пасяджэньне **фіз.-матэм. сэкцыі** навук. т-ва пры БДУ (фізычная аўдыторыя), на якім праф. **Бурстын** зробіць даклад: 1. **«Аб прыбліз. вылічэньнях кораняў»**, 2. **Аб інтэграваньні сыстэм раўнаньняў Пфафа».** Пач. у 17 гадз.

Дзіцячая клініка. Агульны сход членаў сэкцыі ўнутраных хвароб навуковай асацыяцыі пры саюзе Мэдсанпрацы. Паралак дня: арганізацыя сэкцыі. Яўка для дактароў інтэрністых абавязкова.

Дом Камасьветы. Даклад **т. Страноўскага** для камсамольскага актыву па падрыхтоўцы да ўсебеларускага паліграбою. Зьявіцца ўсім членам бюро яч. Уваход па камсамольскіх білетах. Пач. у 18 з пал. гадз.

Клюб Навуковых Працаўнікоў. У 20 гадз. агульны сход членаў клюбу. На парадку дня арганізацыйныя пытаньні. Яўка ўсіх членаў абавязкова.

Клюб Працасьветы. 27 сакавіка, у 19 гадз., склікаецца 1-я група Фрунзаўскага раённага дэлегацкага сходу. У гэты-ж самы дзень і гадзіну ў клюбе Саўгандальслужачых склікаецца 3-я група. Яўка абавязкова.

Вайсковы габінэт БДУ. Абавязковыя заняткі з камскладам запасу назначаюцца: ранішняя група — 6, 15 і 25 у 10 гадз. раніцы; вячэрняя група — у 17 гадз. у тыя-ж лічбы. Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

29-га сакавіка, а 6-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу харчавікоў (рог Пушкінскай і Дзяржынскай вуліц) прэзыдыум БАБРУЙСКАГА АКРПРАФБЮРО і рэдакцыя газэты «ЗЬВЯЗДА» склікаюць

бабруйскую агульна-гарадзкую канфэрэнцыю чытачоў газ. „Зьвязда"

Парадак дня:
1) Даклад рэдакцыі газэты «Зьвязда».
2) Мастацкая частка.
Уваход па разасланых білетах.

ПРЭЗЫДЫУМ АПБ, РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ»

25 сакавіка ў Доме Пісьменьніка адбудзецца ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР, прысьвечаны творчасьці

Я. НЁМАНСКАГА

Даклад аб творчасьці Я. Нёманскага прачытае С. В. Замбрасьцкі.
Пасьля дакладу абмен думкамі. Запрашаюцца пісьменьнікі, настаўнікі, студэнты, навуковыя працаўнікі, рабочая вучнёўская моладзь, рабкоры і іншыя.
Пачатак а 7 з пал. гадзіне ўвечары. Уваход вольны.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

3.500 ПАДПІСЧЫКАЎ НА „ЗЬВЯЗДУ" ПА АРШАНСКАЙ акрузе из КРАСАВІК м-ц 1930 год.

На сакавік месяц падпіска па акрузе складае 2.850 экз.

РАЙКОМЫ, ПАРТ'ЯЧЭЙКІ І ЎПОЎНАВАЖАНЫЯ!

ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНЕЦЕ РАБОТУ па вярбоўцы новых кадраў ПАДПІСЧЫКАЎ

Канкрэтнымі, сапраўднымі мерапрыемствамі па пашырэньні „ЗЬВЯЗДЫ" ВЫКАНАЕМ гэту лічбу.

НІ АДНАГО партыйца і беспартыйнага актывістага БЕЗ „ЗЬВЯЗДЫ"

ЮДА | ЮДА | ЮДА

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Панядзелак, 24 сакавіка. Для саюзу саўгандальслужачых.
РАЗЛОМ Б. Лаўрэнеў. П'еса ў 4 дзеях.
Білеты ў саюзе і МК. Пачатак роўна а 8 гадз.

КІНО „СПАРТАК" ГУМАРЫСТАГА САТЫРЫКА
З панядзелка, 24 сакавіка
звыш праграмы г стролі Пятра САКОЛЬСКАГА
На экране МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПУРГА Драма у 7 част.
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: 1-га—а 7 г., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10 г. 45 м.
Каса—ад 5 г. 30 м.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
Амэрыканскі фільм, вытворч. „Парамовнт-фільм"
У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКУ
драма ў 8 частках.
Рэжысэр Джозэф Штэрнбэрг.
У галоўных ролях:
Д. БАНКРОФТ, КЛАЙД КУК, БЭЦЬЦІ КАМПСОН, МІТЧЭЛЬ ЛЬЮКС, ВОЛЬГА БАКЛАНАВА.
ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ
Пачатак 1-га сэансу а 5 г. 45 м., 2-га—а 7 гадз. 25 м., 3-га—а 9 г. 05 м. і 4-га—а 10 гадз. 45 м.
Вход дзецям ад 5 гадз.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
З панядзелка, 24 сакавіка
палітасьветфільм
БАЙКАЛ у 6 частках.
ЗЬВЫШ ПРАГРАМЫ
ВОЛХАЎБУД у 1 частцы.
ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ.
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз., 2-га—а 3 гадз. 0 м.
Каса—ад 11 з пал. гадз.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА"
АД ПАНЯДЗЕЛКА, 24 САКАВІКА
на вячэрніх і дзённых кіно-сэансах
толькі 3 дні 24, 25 і 26 сакавіка
дэманструецца мастацкі фільм у 6-ці частках
ХАЦІНА ДЯДЗЬКІ ТОМА
кіно-п'еса ў 6-ці частках.
Рэжысэр ГАРЫ ПОЛАРД.
Звыш праграмы ДАГЭСТАН культур-фільм у 2-х част.
Пачатак дзённых сэансаў:
1-га—а 1 гадз. дня, 2-га—а 3 гадз. 15 м.
На дзённыя сэансы цэны зьніжаны ад 10 к. да 35 к.
Пачатак вячэрніх сэансаў:
1-га—а 7 гадз., 2-га—а 8 г. 30 м., 3-га—а 10 г. 30 м.
Каса ад 5 гадз.

)—(кіно)—(„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" працуе бесьперапынна з 12 гадз. дня.
З ПАНЯДЗЕЛКА, 24-га САКАВІКА
Грандыёзны фільм вытворчасьці ф-кі культурфільм „СОВКИНО".
«Здаецца, што гэта—змаганьне за хлеб, на самой справе—гэта змаганьне за сацыялізм».
ЛЕНІН.
ГІГАНТ
Рэжысэр Л. СЬЦЯПАНАВА.
Апэратар У. СЬЦЯПАНАЎ.
Звыш праграмы—амэрыканская камэдыя у 2-х частках.
РАСКЛАД СЭАНСАЎ:
ДЗЕННЫЯ
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. 30 м.
„ 2-га „ а 3 гадз.
На дзённыя сэансы усе білеты па 5 кап.
Каса адчынена ад 12 гадз. дня.
ВЯЧЭРНІЯ
Пачатак 1-га сэансу а 6 г.
„ 2-га „ а 7 г. 40 м.
„ 3-га „ а 9 г. 20 м.
„ 4-га „ а 10 г. 10 м.
Каса адчынена ад 5 гадз. увечары.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва
ПАСТУПІЎ У ПРОДАЖ І РАССЫЛАЕЦЦА:
№ 4 „Чырвоная Беларусь" № 4
Адзіны ў БССР двох-тыднёвы ілюстраваны часопіс
У нумары:
1) П. ГАЛАВАЧ.—Кястрымнае,—апавяданьне.
2) Я. СКРЫГАН.—Буйнымі крокамі, нарыс.
3) А. СТАЛЕВІЧ.—У краіне белага тэрору, нарыс.
4) СССР на замежнай выстаўцы.
5) Ю. ЛЯВОННЫ.—Юбілейная чырвонаармейская, верш.
6) Н. БЯЛІНА-ПАДГАЕЦКІ.—Кулямёт, апавяданьне.
7) Чырвоная армія у аграпаходзе—фота-мантаж.
8) Г. РУГЕР—Пад пятою баяр, нарыс.
9) А. ЛЯХАВІЦКІ.—Камунараўцы, нарыс.
10) В. ШЭМПЕЛЬ.—Лірыка сталі, верш.
11) Н. ДЗІМЕНШТЭЙН:—Ідзе новы чалавек, нарыс.
12) За два тыдні.
13) Я. МАУР.—Грамадзяне сваёй краіны, фэльетон.
14) Годныя і нягодныя, гумар.
У нумары 73 малюнкі і фота-здымкі і карыкатуры.

ВЫШЛІ З ДРУКУ і паступілі ў продаж
Заданьні для першага курсу завочнага рабфаку, выпуск сёмы.
Стар. 80. Цана 60 кап.
Кніжка прадаецца ў Цэнтральнай Кнігарні БДВ і Акруговых Аддзяленьнях БДВ.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ФАБРЫКА цацак і лазовых вырабаў імя Крупскай у Менску ЗЬМЯШЧАЕЦЦА па М. Серабранцы (Тры карчмы). Тэл. № 15-98.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяндзе па тэл. 2-49

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.

Менск, Ганбулітбел № 337.